

**Што агульнага паміж гумарам і матэматыкай?**

СТАР 3



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**



**Кадры вырашаюць усё… Асабліва ў медыцыне!**

СТАР 6

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

15 ЛІСТАПАДА 2013 г. ПЯТНІЦА № 215 (27580) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## НАЗНАЧАНЫ НОВЫЯ СТАРШЫНІ АБЛВЫКАНКАМАЎ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка назначыў Уладзіміра КРАЎЦОВА старшынёй Гродзенскага аблвыканкама. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**



Краўцоў Уладзімір Васільевіч нарадзіўся ў 1953 годзе ў горадзе Падпарожжа Ленінградскай вобласці. У 1975 годзе скончыў Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут, у 1991 годзе — Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС.

У 1975—1979 гадах працаваў майстрам, механікам, намеснікам начальніка цэха Магілёўскага аўтазавода імя С.М. Кірава. У 1979—1981 гадах быў інструктарам Магілёўскага гаркама КПБ, у 1981—1983 гадах — загадчыкам прамыслова-транспартнага аддзела Акцябрскага райкама КПБ Магілёва, у 1983—1985 гадах — інструктарам Магілёўскага абкама КПБ. У 1985—1991 гадах з'яўляўся сакратаром парткама Магілёўскага аўтазавода імя С.М. Кірава, другім сакратаром Магілёўскага гаркама КПБ. З 1991 года працаваў выканаўчым дырэктарам Магілёўскай рэгіянальнай асацыяцыі міжгаліновага дзелавога супрацоўніцтва «ІНІН», з 1997 года — намеснікам дырэктара ТАА «МП РУХ» Магілёва. З 1998 года — дырэктарам таварыства з дадатковай адказнасцю «Трансэнерга-Захад» Магілёва.

У 2001—2002 гадах займаў пасаду старшыні камітэта эканомікі і рыначных адносін Магілёўскага аблвыканкама, у 2002—2007 гадах быў намеснікам старшыні Магілёўскага аблвыканкама, а ў 2007—2012 гадах — першым намеснікам старшыні Магілёўскага аблвыканкама. З 2012 года з'яўляецца старшынёй Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па эканамічнай палітыцы.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі».

❑❑❑



**Аляксандр Лукашэнка назначыў Сямёна ШАПІРУ старшынёй Мінскага аблвыканкама.**

Сямён Шапіра нарадзіўся ў 1961 годзе ў вёсцы Рачэнь Любанскага раёна Мінскай вобласці. Доктар эканамічных навук, прафесар. Працаваў галоўным эканамістам саўгаса «Камсамолец» (Дзяржынскі раён), старшынёй СКП «Маяк» (Дзяржынскі раён). У 1998—1999 гадах — дырэктар Беларускага навукова-даследчага інстытута эканомікі і інфармацыі аграпрамысловага комплексу. У 1999—2004 гадах працаваў у сістэме Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі. З 2004 года — генеральны дырэктар ААТ «Агракамбінат «Дзяржынскі». З красавіка 2008 года — міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі. З мая 2010 года — старшыня Гродзенскага аблвыканкама.

■ Заканатворчасць

## ГЭТА НАШЫ ЛЮДЗІ

Законапраект «Аб беларусах замежжа» рыхтаваўся Міністэрствам замежных спраў з 2008 года. У парламенце яго планавалася разгледзець яшчэ ў 2011-м, але тэрміны былі перанесены з-за недастатковай гатоўнасці дакумента.

— Дакумент перш за ўсё прызначаны закласці асновы для сістэмнай работы беларускай дзяржавы з беларусамі замежжа, стварыць прававыя перадумовы для рэалізацыі адпаведнай дзяржаўнай праграмы і іншых падзаконных нарматыўных актаў, комплексу мер, якія накіраваны на далейшае развіццё супрацоўніцтва, — патлумачыў журналістам **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Віктар ФЯСАК**.

Згодна з рознымі крыніцамі інфармацыі, у нашы дні за межамі радзімы пражывае ад 1,5 да 3,5 млн беларусаў. У многіх краінах існуюць беларускія дыяспары, якія зацікаўленыя ў тым, каб сувязі з Бацькаўшчынай не перарываліся. У Польшчы пражывае каля 200 тысяч беларусаў, у Латвіі — 96 тысяч, Літве — 95 тысяч, Казахстане —100 тысяч, у Расійскай Федэрацыі — каля 1 млн. У Ізраіль з 1970-х гадоў да 2002 года ўключна выехала каля 50 тысяч нашых суайчыннікаў. Беларусы жывуць таксама ва Украіне, у Эстоніі, Вялікабрытаніі, ЗША, Канадзе, Аргенціне, Чэхіі, Іспаніі, Італіі і многіх іншых дзяржавах.

СТАР 2

ПРАМАЯ ЛІНІЯ

### ЁСЦЬ ПЫТАННЕ ПА ПЕНСІІ? ВАМ АДКАЖА СПЕЦЫЯЛІСТ

**У аўторак, 19 лістапада, Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі** разам з газетай «Звязда» правядзе **«прамую лінію», прысвечаную пытанням пенсійнага забеспячэння**.

На вашы пытанні адкажа **начальнік галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння Наталля Уладзіміраўна МУРАШКЕВІЧ**.

**Тэлефануйце 19 лістапада з 10 да 11 гадзін па тэлефоне 8 (017) 222-49-72. Папярэднія пытанні можаце задаваць па тэлефоне 8 (017) 287 18 29.**

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.



## ІДЗЕМ СЛУЖЫЦЬ АЙЧЫНЕ!

**Пачалася адпраўка новага папаўнення ва Узброеныя Сілы, іншыя войскі і воінскія фарміраванні Беларусі. Першымі да армейскіх радоў далучыліся прадстаўнікі элітных войскаў — роты ганаровай варты, сіл спецыяльных аперацый Узброеных Сіл, механізаваных злучэнняў і войскаў сувязі. Іншыя воінскія часці краіны папоўняцца навабранцамі да канца лістапада, у тым ліку і тымі прызыўнікамі, хто будзе праходзіць службу ў рэзерве.**

— У адпаведнасці з заканадаўствам, прызыўныя камісіі гэтай восенню павінны прайсці больш за 100 тысяч маладых грамадзян, — зазначыў **першы намеснік начальніка галоўнага арганізацыйна-мабілізацыйнага ўпраўлення Генеральнага штаба Узброеных Сіл Беларусі, палкоўнік Сяргей ПУЗАКОЎ**. — Зараз рашэнні ўжо прыняты ў дачыненні да звыш 70 тысяч прызыўнікоў. Прычым прадастаўлена больш чым 34 тысячы адтэрміновак. Як звычайна, большую іх частку — амаль 70% — складаюць адтэрміноўкі для працягу адукацыі. Акрамя таго, прадстаўлены адтэрміноўкі па сямейных абставінах, па стане здароўя, для атрымання ваенна-тэхнічнай спецыяльнасці і для выканання дэпутацкіх паўнамоцтваў.

Адпраўка новага папаўнення ажыццяўляецца ва Узброеныя Сілы, транспартныя войскі, унутраныя войскі МУС, органы пагранічнай службы і органы дзяржаўнай бяспекі. Для праходжання тэрміновай ваеннай службы на пасадах салдат і сяржантаў плануецца накіраваць каля 10 тысяч чалавек. Акрамя таго, 2 тысячы прызыўнікоў будуць праходзіць службу ў рэзерве.

У першы дзень адпраўкі армейскія рады краіны папоўнілі больш за тысячу прызыўнікоў. Сярод іх — і Арцём Малахавецкі, які будзе служыць у 5-й брыгадзе спецыяльнага прызначэння. Трапіць у армію юнак марыў яшчэ са школы. І нягледзячы на тое, што пасля першага класа разам з маці з'ехаў на Далёкі Усход у Амурскую вобласць, вайсковае майстэрства вырашыў спасцігаць на Радзіме.

— Ніякія павесткі да мяне не прыходзілі, у мінскі ваенкамат прыйшоў сам, — расказвае Арцём. — Я лічу, што кожны хлопец павінен служыць у арміі. Калі ж у яго такога жадання няма, то, значыць, з ім нешта не тое. Што да мяне, то калі б не армія, я мог зусім сюды не прыехаць. Менавіта служба стала для мяне магчымасцю застацца на Радзіме.

Хваляванне сённяшніх прызыўнікоў камандзіру аддзялення 49-й радыётэхнічнай брыгады Івану Чыкуну зразумела, як нікому. Год таму мінчанін стаяў на гэтым жа месцы ў прадчуванні новага жыцця.

— Ужо вечарам цяперашнія хлопцы-хуліганы стануць дысцыплінаванымі юнакамі, дастаткова ім толькі апрануць ваенную форму, — перакананы Іван. — Адслужыўшы год у арміі, я зразумеў, хто сябар, а хто не. Войска стала і добрай школай жыцця, дзе я ўпэўніўся ў вернасці сваёй дзяўчыны, зразумеў, што вельмі люблю сваіх родных, вырашыў, чаго я хачу дасягнуць і якім чынам. Я ўпэўнены, што вопыт, атрыманы падчас службы ў арміі, дапаможа мне выйсці сухім з вады ў любой сітуацыі.

...Час ідзе імгненна. Не паспеюць юнакі звыкнуцца з армейскім распарадкам, як зноў будуць дома, у коле родных і блізкіх. А пакуль яны ўбачацца толькі праз месяц, падчас урачыстай цырымоніі прыняцця ваеннай прысягі.

**Вераніка КАНЮТА.**

ЦЫТАТА ДНЯ



**Дзмітрый СЕМЯНКЕВІЧ, намеснік міністра архітэктуры і будаўніцтва:**

*«Будаўніцтва неабходнай інфраструктуры будзе прывязана да ўводу ў эксплуатацыю жылых аб'ектаў. У гонцы за квадратнымі метрамі стала адставаць інжынерная і сацыяльная інфраструктура. Каб вырашыць гэтую праблему, мы дапрацавалі праект указа, якім дакладна вызначаецца залежнасць паміж здачай жылога аб'екта ў эксплуатацыю і падрыхтоўкай і будаўніцтвам неабходнай інфраструктуры. Узвядзенне інжынернай інфраструктуры павінна ажыццяўляцца загадзя альбо з уводам першага жылога дома. Гэта ж адносіцца і да сацыяльнай інфраструктуры. Мы вызначылі пералік сацыяльных аб'ектаў, якія абавязкова павінны ўзводзіцца пры будаўніцтве жылля, а таксама аб'екты, якія забяспечваюць бяспеку: медыцынскія ўстановы, міліцыя, пажарныя службы».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.11.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9280,00 | ▲ |
| Еўра | 12490,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 284,00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1132,54 | ▲ |

■ Платныя дарогі

## КІРОЎЦЫ ПАВІННЫ «ПАСЯБРАВАЦЬ» З ЭЛЕКТРОНІКАЙ, КАБ НЕ ПЛАЦІЦЬ ДВОЙЧЫ

**Нагадаю, што з першых дзён жніўня ў Беларусі стартавала камерцыйная эксплуатацыя электроннай сістэмы BelToll, з дапамогай якой здзяйсняецца спагнанне платы за праезд па некаторых дарогах краіны. У першыя дні дзеяння новага праекта не ўсе кіроўцы транспартных сродкаў сур'ёзна падрыхтаваліся да электроннага новаўвядзення як тэхнічна, так і арганізацыйна. Тады колькасць розных парушэнняў у сістэме дасягала 2,5-3 тысяч выпадкаў у суткі. Цяпер гэтая сітуацыя істотна змянілася і практычна стабілізавалася.**

### Парушэнні на ўзроўні 1%

— Колькасць парушэнняў у сістэме BelToll з пачатку эксплуатацыі складае менш за 1% ад усіх транзакцый, якія праходзяць у сістэме і рэгіструюцца ёй, — расказвае менеджар па маркетынгу і сувязях з грамадскасцю кампаніі-аператара сістэмы BelToll акцыянернага таварыства «Капш Тэлематыка Сэрвісіз» Сяргей Буры. — У лістападзе фіксуецца максімум 600 парушэнняў у суткі, а вось абсалютная большасць транзакцый праходзіць у штатным рэжыме, адзначаюць прадстаўнікі кампаніі-аператара. Кіраўніцтва кампаніі гарантуе, што неабгрунтаваных налічэнняў аплаты ў павялічаным памеры не адбываецца. Усе без выключэння падазроныя выпадкі разглядаюцца ў індывідуальным парадку і праходзяць шматступенную сістэму праверкі. Толькі пасля таго, як у спецыялістаў не застаецца сумневаў у факце парушэння, інфармацыя перадаецца ў транспартную інспекцыю.

СТАР 2



Фота БЕЛТА.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЕЎРАСАЮЗ ПАПЯРЭДЗІЎ УКРАІНУ



Працэс еўраінтэграцыі Украіны можа зацягнуцца на нявызначаны час. Такімі наступствамі прыгразіў краіне Еўрапарламент у тым выпадку, калі адпаведнае пагадненне не будзе падпісана на саміце «Усходняга партнёрства» ў Вільнюсе. 2014-ы — гэта год выбараў у Еўрапарламент, затым абранне новай Еўракамісіі, а 2015-ы — год новых прэзідэнцкіх выбараў ва Украіне. Паводле слоў прадстаўніка місіі Еўрапарламента, тады будзе не да таго, «каб займацца Украінай».

Кіеў плануе падпісаць у канцы лістапада гэтага года пагадненне з Еўрапейскім саюзам аб асацыяцыі, якое прадугледжвае стварэнне зоны свабоднага гандлю. Аднак кіраўнік МЗС Польшчы Радаслаў Сікорскі ў канцы кастрычніка заяўляў, што Еўрасаюз можа перанесці падпісанне пагаднення аб асацыяцыі з Украінай на 2014 год, калі ўкраінскія ўлады не паспеюць выканаць усе неабходныя ўмовы для падпісання гэтага дакумента да віленскага саміту.

### У ЛАТВІІ ЎВЯДУЦЬ ПАДАТАК ДЛЯ ТУРЫСТАЎ

Ахвотных адпачыць у сталіцы Латвіі Рызе могуць абавязаць з 1 студзеня 2014 года плаціць турыстычны падатак. Яго сума складзе ўсяго адзін-два еўра.



Улады патлумачылі сваю ініцыятыву рэзкім павелічэннем колькасці турыстаў. Плата з адпачывальнікаў стане сімвалічнай і складзе адзін-два еўра з турыста за ноч. Прычым у танных гасцініцах падатак будзе меншым, а ў адносна дарагіх — большым. Колькасць турыстаў у Рызе ў параўнанні з 2009 годам павялічылася ў тры разы і на канец 2013 г. складзе больш за два мільёны чалавек. 25% адпачывальнікаў — гэта расійскія турысты.

З пачаткам летняга сезона ў 2014 годзе латвійскі горад-курорт Юрмала таксама ўвядзе турыстычны збор з адпачывальнікаў. Падатак будуць спаганяць з усіх турыстаў, якія спыняюцца ў горадзе на начлег, у залежнасці ад месца размяшчэння. Тарыф за аднаго чалавека ў суткі складзе адзін еўра для гасцініц, гасцявых дамоў і кватэр гасцінічнага тыпу, 30 еўрацэнтаў — для лячэбных устаноў, санаторыяў і курортна-рэабілітацыйных цэнтраў, а 20 еўрацэнтаў — для кемпінгаў і хостэлаў.

ISSN 1990 - 763X

13215

9 771990 763008

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### САЦЫЯЛЬНЫЯ СЕТКІ ШКОДЗЯЦЬ ПСІХІЦЫ АДЗІНОКІХ ЖАНЧЫН



Адзінокія жанчыны не павінны праглядаць профілі сваіх паспяховых сяброў у сацыяльных сетках. Паводле слоў псіхолагаў, гэта можа рэальна падарваць іх здароўе.

Спецыяліст Зоі Стрымпель падкрэслівае: сацыяльныя сеткі пастаянна «бамбяць» карыстальнікаў малюнкамі ідэальнага жыцця, вяселляў, дзяцей, што выклікае ў людзей зайздрасць і спрыяе развіццю інтэрнэт-вуаерызму. У выніку ў чалавека можа ўзнікнуць адчуванне таго, быццам яго жыццё пустое. Стрымпель заклікае адзінокіх жанчын цалкам адмовіцца ад сацыяльных сетак. Дарэчы, па яе словах, слабы пол праводзіць больш часу ў пошуках патэнцыйных жаніхоў у інтэрнэце. А наяўнасць персанальных звестак у профілях сацыяльных сетак прымушае жанчын празмерна аналізаваць кандыдатаў. Урэшце, складваецца ўражанне, што гэтыя людзі ўжо прысутнічаюць у жыцці жанчыны.

КОРАТКА

Беларусь плануе павялічыць у 2014 годзе пастаўкі нафтапрадуктаў прыкладна да $9 млрд.

Польшча выступае за поўную адмену віз з Беларуссю, заявіў учора на прэс-канферэнцыі Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Польшчы ў Беларусі Лешак Шарэпка.

Сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі Беларусі за студзень—верасень 2013 года склалася адмоўнае ў памеры $372,3 млн.

Дакументальная стужка «Драўляны народ» рэжысёра Віктара Аслюка ўдастоена прыза глядацкіх сімпатый у катэгорыі фільмаў працягласцю да 45 хвілін на X Міжнародным кінафестывалі Filmfest Eberswalde ў Германіі. У карціне за 26 хвілін расказваецца пра адзінокага старога — разьбяра па дрэве Мікалая Васільевіча Тарасюка.

Самы дарагі брыльянт у свеце прададзены ў Жэневе з малатка за $74 млн. Камень набыў Ісаак Вольф, вядомы нью-ёркскі аграншчык, які і перайменаваў яго ў Pink Dream — «Ружовую мару».

## НА ШТО ВЫ ГАТОВЫЯ ДЗЕЛЯ ГРОШАЙ?



**Саша НЭМА, спявак:**

— Грошы, вядома, адыгрываюць вялікую ролю сёння. Але для мяне больш важна сяброўства, падтрымка людзей, якія падзяляюць мае ідэі. У той жа час, як гаспадар, як галава сям'і, я не магу не думаць аб сямейным дабрабыце. Трэба старацца сумяшчаць мэту ў жыцці, свой любімы занятак са сваёю працай. Важна дасягнуць пэўных вяршынь і пры гэтым не застацца галодным. Пераступіць цераз сумленне, мне здаецца, я не змагу. Але ж у кожнага межы сумлення могуць быць свае.



**Яўгенія ЗЯЛЕНСКАЯ, журналіст, фатограф:**

— Пытанне ставіць мяне ў тупік. Першая рэакцыя — ні на што. Бо што такое грошы? Мне іх заўсёды дастаткова цяпер. Калі ёсць чым аплаціць рахункі і ежу — усё выдатна. Аднак, успамінаючы галодныя студэнцкія часы з немаўлём на руках, я разумею, што тады для мяне грошы значылі вельмі шмат. Парадокс толькі ў тым, што і тады я была гатова дзеля іх толькі на... працу. Нармальную працу (хоць прыбіральшчыцай, хоць сядзелкай у доме састарэлых). Мае аднакурсніцы хацелі ад жыцця большага і падзараблялі ў стрып-бары. Але ў мяне ні разу не ўзнікла нават думкі пра магчымасць вырашэння матэрыяльных праблем падобным чынам. Тым больш, я фаталістка ў плане «лёгкіх» грошай»: па маім сціплым меркаванні, толькі заробленае сумленна прынясе радасць. Калі разважаць агульна, то тут трэба падзяляць два моманты: калі ў цябе хапае сродкаў на неабходнае і калі ты па вушы ў даўгах і дзеці галодныя дома. У першым выпадку развагі пра тое, на якія здзелкі з сумленнем ідзе чалавек дзеля ўзбагачэння, могуць даць цікавы вынік, часам ашаламляльны. У другім — ступень адчаю чалавека трохі апраўдвае яго ў вашых вачах.



**Аляксандр БАРАВЫ, праграміст:**

— Дзеля грошай я гатовы працаваць 8 гадзін у дзень. Час занадта дарагі, каб марнаваць яго. Таму дзеля грошай можна выдаткоўваць толькі трэцюю частку жыцця. А ў астатні час трэба жыць.

**Падрыхтаваў Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

# ГЭТА НАШЫ ЛЮДЗІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

З беларусамі за мяжой працуюць у нашай дзяржаве міністэрствы замежных спраў, культуры, адукацыі, інфармацыі, апарат Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў. Менавіта праз апарат Упаўнаважанага з 1993 года рэалізуецца праграма «Беларусы ў свеце». Дзякуючы гэтай праграме за кошт бюджэтных сродкаў былі набыты і адпраўлены ў беларускія дыяспары атрыбуты дзяржаўнай сімволікі, нацыянальныя строі для мастацкіх калектываў, музычныя інструменты, аргтэхніка, відэаматэрыялы.

— У маі на пасяджэнні «круглага стала» ў Міністэрстве замежных спраў Беларусі, якое было прысвечана законапраекту, ішла размова пра тое, што нядрэнна было б мець «карту беларуса», але мы пакуль яшчэ не можам сабе гэтага дазволіць, — заўважыў парламентарый. — Тым не менш, мы не маем права казаць, што мала робім для суайчыннікаў.

Пры падрыхтоўцы законапраекта выкарыстоўваўся досвед Азербайджана, Венгрыі, Ізраіля, Кітая, Украіны, Расіі, Славакіі і многіх іншых краін, паведаміў Віктар Фясак.

Згодна з дакументам, галоўным каардынатарам у дзяржаўным рэгуляванні адносін з беларусамі замежжа будзе выступаць Міністэрства замежных спраў Беларусі.

— Мы лічым, што прыняцце такога закона будзе садзейнічаць забеспячэнню салідарнасці беларусаў ва ўсім свеце, захаванню нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці беларусаў замежжа і ўмацаванню сувязяў з Беларуссю, — сказаў Віктар Фясак. — Спадзяёмся таксама, што новы закон будзе садзейнічаць вяртанню беларусаў на радзіму.

**Валерый КАЗАКОЎ, старшыня Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі «Беларусы Расіі»:**

— Гэта закон актуальны, патрэбны, прымаць яго трэба было даўно. Мы ўсе яго абмяркоўвалі, прыйшлі да кансенсусу па праблемных пытаннях. Добра, што беларуская дэмакратыя дае магчымасць браць удзел у заканатворчасці грамадзянам не толькі сваёй краіны, але і іншых краін, бо будучы закон іх датычыцца. Мы абмяркоўвалі законапраект ва ўсіх арганізацыях. У выніку беларуская дыяспара ў Расіі ўнесла больш за 20 прапаноў, большасць з якіх у праекце ўлічана. Але не забывайце, што закон прымаецца для дзяржслужачых, яны павінны будуць выкарыстоўваць яго ў сваёй практыцы.

Што тычыцца «карты беларуса», то для беларусаў, якія пражываюць у Расіі, яна не актуальная. Мы і без таго жывём у Саюзнай дзяржаве, не адчуваем ніякай дыскрымінацыі, па які б бок мяжы ні знаходзіліся. Каб не атрымалася, што той, хто валодае «картай беларуса», не аказаўся па статусе вышэй за грамадзяніна Рэспублікі Беларусь. У Польшчы прыдумалі «карту паляка» для таго, каб перш за ўсё прыцягнуць да сябе танную працоўную сілу з Беларусі і Украіны. Для Беларусі гэта не актуальна.

**Ян СЫЧЭЎСКІ, кіраўнік Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Польшчы:**

— Мы задаволены тым, што дзяржава цікавіцца беларусамі замежжа. Далей усё будзе залежаць ад таго, як закон гэты, калі яго прымуць, будзе рэалізоўвацца. Вядома, што законы рэалізуюцца па-рознаму. Гэта залежыць ад добрай волі і ад магчымасцяў. Калі здзейсніцца і першае, і другое, то гэта будзе выдатна для беларусаў замежжа.

«Дагэтуль добрая воля з боку беларускай дзяржавы ярка праяўлялася ў дачыненні да беларусаў замежжа, — казаў Ян Сычэўскі журналістам яшчэ ў маі, падчас свайго ўдзелу ў пасяджэнні «круглага стала» ў Міністэрстве ўнутраных спраў Беларусі, якое было прысвечана законапраекту. — Яна дапамагала нам як магла, а часам — і намнога больш. Мы бачылі тое з боку дзяржаўных дзеячаў, міністэрстваў, рэгіянальных улад: усе яны нам дапамагалі. З гэтай мэтай быў створаны і Культурны цэнтр Рэспублікі Беларусь у Польшчы, які выдатна працуе ў сферы культуры, асветы».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# ПРАКУРОР ПАВІНЕН БАЧЫЦЬ УСЁ

**Аляксандр Лукашэнка 14 лістапада прыняў з дакладам Генеральнага пракурора Аляксандра Канюка.**

У цэнтры ўвагі была крымінагенная сітуацыя ў краіне, а таксама выкананне дадзеных раней даручэнняў кіраўніка дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка канстатаваў рост колькасці цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў. «Яны ёсць, насцярожвае рост. Хай на дзясятак — гэта рост», — адзначыў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на важнасць прафілактыкі злачынстваў. «Сямейна-бытавыя адносіны. Што там адбываецца? Я думаю, што трэба ў бліжэйшы час паглядзець на гэтыя пытанні», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Прэзідэнт закрануў тэму эфектыўнага выкарыстання сродкаў, што накіроўваюцца на мадэрнізацыю прадпрыемстваў, якая актыўна вядзецца сёння ў краіне.

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў таксама адсочваць сітуацыю са своечасовай выплатай заработнай платы: «Так, у нас гэта не набывае шырокага размаху, але ёсць калектывы, дзе зарплату плацяць не своечасова. Пракурор гэта павінен бачыць».

Кіраўнік дзяржавы запатрабаваў даладжыць аб канкрэтных крымінальных справах, у тым ліку карупцыйных, якія маюць грамадскае гучанне і знаходзяцца на кантролі ў Прэзідэнта. «Пасля таго як нам прыйшлося адмовіцца ад паслуг вашага намесніка Архіпава, гэта мяне пачынае насцярожваць. Можа, у нас сапраўды ў праваахоўных органах асобныя людзі займаюцца не тым, чым трэба. Недапушчальна, калі мы адмаўляем у даверы намесніку Генеральнага пракурора, звальняем яго. Гэта ненармальна», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

«Дружкі там яго ўцягнулі ў гэтую аферу, чалавека забілі, п'яны кіроўца. Не важна, якія ў іх там былі адносіны, але чалавек загінуў. Уявіце, як рэагуе на гэта сям'я. З дапамогай улады гэтую справу «замялі». Што падумаюць людзі, сям'я? Падумаюць, што ў нас улады няма? Дзе справядлівасць?» — сказаў Прэзідэнт.

Ён даручыў Генеральнай пракуратуры сумесна з Вярхоўным Судом больш старанна разбірацца ў рэзанансных справах, такіх, як жорсткае забойства дзяўчыны ў Гомелі. «Калі ты нягоднік і падонак ідзеш і не першы раз ужо робіш злачынства, забіваеш чалавека, то якое права ты маеш жыць на гэтай зямлі? Я не крываважэрны, але адплата і пакаранне павінны быць адпаведнымі».

Як было даложана кіраўніку дзяржавы, агульны ўзровень злачыннасці ў краіне знізіўся пры некаторым росце колькасці асабліва цяжкіх і цяжкіх злачынстваў. Адна з прычын, на думку Аляксандра Канюка, крыецца ў недастатковай увазе, якая надавалася прафілактыцы бытавых злачынстваў на фоне актывізацыі барацьбы з эканамічнымі, карупцыйнымі правапарушэннямі. Генеральны пракурор выказаў упэўненасць, што ў бліжэйшы час сітуацыя будзе выпраўлена.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**




**14 лістапада адбыўся семінар з кіраўнікамі рэспубліканскіх сродкаў масавай інфармацыі на тэму «Сучасны стан і перспектывы развіцця Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь». Кіраўнікі рэспубліканскіх СМІ азнаёміліся з сучаснымі і перспектыўнымі кірункамі ваеннага будаўніцтва, абмеркавалі прыярытэтныя аспекты супрацоўніцтва Міністэрства абароны і дзяржаўных СМІ ў інфармацыйнай сферы ў інтарэсах забеспячэння нацыянальнай бяспекі Беларусі.**

**На здымку:** *выступае памочнік міністра абароны па ідэалагічнай рабоце ва Узброеных Сілах — начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь Аляксандр ГУРА.*

■ Блізкая ўлада

# ВЯЛІКІЯ ПРАБЛЕМЫ МАЛЕНЬКАГА ЧАЛАВЕКА

## абмяркоўваліся на прыёме ў старшыні выканкама Магілёўскай вобласці Пятра Рудніка

**Мабыць, калі б на месцах да спраў гэтых людзей у свой час паставіліся больш уважліва, яны б даўно вырашылі свае пытанні. Але нястача грошай, памылкі адказных службовых асоб, а дзесьці, не выключана, і абыякавае стаўленне да чужых праблем зрабілі неабходным умяшанне больш высокай інстанцыі.**

У жыхароў дома 1955 года пабудовы па вуліцы Вытворчая вёскі Салтанаўка адна праблема на ўсіх — няма гарачай вады. Магілёўскі райвыканкам летась звярнуўся да жыхароў з прапановай падключыць дом да цэнтралізаванага газазабеспячэння. Людзі падтрымалі гэты зварот і нават пагадзіліся зрабіць унутрыдамавую «развязку» за свой кошт. Тэрміны ўводу намячаліся на гэты год, але чаканні не спраўдзіліся.

Праектная дакументацыя гатова, але раптам стала вядома, што газіфікацыя адкладваецца на няпэўны тэрмін. Абурэнне жыхароў зразумелае: ім зноў давядзецца абыходзіцца без гарачай вады. Каб разабрацца ў гэтым пытанні, на сустрэчу былі запрошаны прадстаўнікі кіраўніцтва газавай і камунальнай службаў вобласці. Яны запэўнілі, што 1 ліпеня наступнага года блакітнае паліва прыйдзе ў кватэры грамадзян. Людзі засталіся задаволеныя адказам, а пытанне было пастаўлена на кантроль у аблвыканкаме.

Больш складанай аказалася праблема жыхароў кватэры аднаго з жылых дамоў па праспекце Міру ў Магілёве. Пенсіянеры на працягу 7 гадоў абіваюць парогі розных інстанцый. Пад іх кватэрай, што на 1-м паверсе, знаходзіцца цеплавузел. Пажылыя людзі паскардзіліся, што па 2-3 разы на год здараюцца аварыі, якія наносяць шкоду іх маёмасці. Даводзіцца рабіць чарговы рамонт. А дзе браць грошы? Напрыклад, сёлета ў ліпені давялося паднімаць падлогу ў адным з пакояў — бо пад ім лопнула труба і некалькі гадзін запар лілася вада. Акрамя гэтага, жыхары пакутуюць ад бесперапыннага шуму бойлернай. Праблему не вырашыў нават капрамонт, які адбыўся сёлета.

Губернатар патрабаваў неадкладна зрабіць захады і правесці незалежную экспертызу па гэтай справе. А каб вынікі яе былі больш абгрунтаванымі, у склад камісіі параіў уключыць і гаспадыню злашчаснай кватэры. Тым больш што яна выконвае абавязкі старшай па пад'ездзе. Пётр Руднік таксама запатрабаваў ад адказных асоб, каб была дапрацавана праектна-каштарысная дакументацыя па бойлернай і разгледжана магчымасць пераносу цеплавузла ў іншае месца. Абласной санслужбе даручана правесці замер шуму ў гэтай кватэры. Па выніках зробяць дапрацоўку праектнай дакументацыі. Праблема да самага яе вырашэння будзе знаходзіцца на кантролі ў губернатара.

Пётр Руднік вельмі крытычна адазваўся аб працы камунальных службаў горада. Ён патрабаваў ад адказных асоб больш уважліва займацца капрамонтамі дамоў. «Яны павінны быць якаснымі, каб мы не вярталіся да аднаго і таго ж будынка кожны год», — падкрэсліў ён. Акрамя гэтага, больш уважліва трэба ставіцца і да зваротаў грамадзян. Справа з цеплавузлом павінна была вырашацца на ўзроўні гарвыканкама, аднак выйсце так і не было знойдзена на працягу 7 гадоў. Пётр Руднік выказаў надзею, што новы мэр — Уладзімір Цумараў — больш уважліва будзе ставіцца да скаргаў жыхароў.

Недапрацоўкай на месцах назваў губернатар і праблему, звязаную з аб'яднаннем сельсаветаў. На прыём звярнуўся прадстаўнік 4-х вёсак Магілёўскага раёна, якія збіраюцца далучыць да Махаўскага сельсавета. Пад зваротам падпісаліся 247 грамадзян. Яны не супраць аптымізацыі, але ім больш даспадобы іншы сельсавет — Вейнянскі, які да таго ж знаходзіцца значна бліжэй да іх вёсак. Жыхарам зручней дабірацца да Вейна, чым да Махава. Як высветлілася, падставай для хваляванняў стала інфармацыя пра далучэнне, размешчаная на сайце райвыканкама. Пётр Руднік адзначыў, што з'яўленню гэтай інфармацыі павінен быў папярэднічаць агульны сход жыхароў, дзе б ім растлумачылі, у чым справа... Пытанне аб аптымізацыі адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўпарадкавання будзе разглядацца абласным Саветам дэпутатаў праз некалькі тыдняў. І гэтае пажаданне жыхароў Магілёўскага раёна будзе таксама ўлічана.

— Аптымізацыя сапраўды неабходна, — адзначыў Пётр Міхайлавіч. — Ёсць вёскі, дзе сёння пражывае ўсяго некалькі чалавек. Іх абслугоўванне вядзе да неабгрунтаваных эканамічных выдаткаў. Гэта таксама трэба разумець.

Па ўсіх пытаннях, якія былі разгледжаны на прыёме ў губернатара, былі прыняты канкрэтныя рашэнні і прызначаны даты іх выканання.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

■

НАВІНЫ

## НА НАСТУПНЫМ ТЫДНІ ЗНОЎ ПАЦЯПЛЕЕ

**У пятніцу тэрыторыя нашай краіны трапіць у зону павышанага атмасфернага ціску, які быў сфарміраваны ў вільготным паветры, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

Менавіта таму будзе без істотных ападкаў, толькі месцамі ў Віцебскай вобласці пройдуць невялікія ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Максімальная тэмпература паветра ўдзень плюс 1—6 градусаў. А вось у суботу да нас завітаюць атмасферныя франты з боку Балтыйскага мора, якія прынясуць у паўночна-ўсходні рэгіён Беларусі мокры снег і дождж. Месцамі магчымы туман. Уначы і раніцай у асобных раёнах слабы галалёд. Тэмпература паветра ў ноч на суботу ад мінус 3 да плюс 2 градусаў, удзень — ад 0 да 6 цяпла.

Пад уплывам атмасферных франтоў атлантычнага паходжання на большай частцы краіны будуць ісці караткачасовыя дажджы. У асобных раёнах туман. Уначы на нядзелю тэмпературны фон складзе ад мінус 1 да плюс 5 градусаў, удзень — 3—8 цяпла.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак месцамі чакаюцца невялікія дажджы. У асобных раёнах туман. Мінімальная тэмпература паветра ўначы на панядзелак ад 0 да плюс 5 градусаў, пры праясненнях — да мінус 2, удзень — 2—7 цяпла. А ўвогуле да сярэдзіны наступнага тыдня чакаецца ўмерана цёплае для лістапада надвор'е, калі ўдзень будзе плюс 3—9 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## БАЗАВАЯ ВЕЛІЧЫНЯ Ў 2014 ГОДЗЕ МОЖА БЫЦЬ ПАВЯЛІЧАНА ДА BR150 ТЫС.

**Аб гэтым паведаміў учора намеснік міністра фінансаў Максім Ермаловіч на пашыраным сумесным пасяджэнні пастаянных камісій Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы і па бюджэце і фінансах, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

З 1 кастрычніка 2013 года базавая велічыня ў Беларусі была павялічана на Br30 тыс. да Br130 тыс. Да гэтага яна была павышана з 1 красавіка 2012 года — з Br35 тыс. да Br100 тыс.

Базавая велічыня — гэта эканамічны паказчык, які вызначае абстрактную каштоўнасць пакупной здольнасці грошай, не звязаную з ацэнкай якіх-небудзь канкрэтных матэрыяльных або нематэрыяльных даброт. Базавая велічыня была ўведзена ў Беларусі з 2002 года, прымяняецца для вылічэння многіх паказчыкаў і нарматываў у сферы працоўных праваадносін, вызначае памер штрафаў і пошлін.

ПАДЗЕІ

## У НАСТУПНЫМ ГОДЗЕ ТАРЫФЫ НА ПАСЛУГІ ЖКГ ПАВІННЫ ПАВЫСІЦЦА НА 10-11%

**Кампенсацыю насельніцтвам паслуг ЖКГ у Беларусі плануецца павысіць у 2014 годзе да 35%. Аб гэтым заявіў учора ў парламенце намеснік міністра эканомікі Аляксандр ЯРАШЭНКА.**

Размовы аб тым, што датацыі дзяржавы на паслугі ЖКГ неабходна скарачаць, вядуцца ўжо даўно.

— Сёння насельніцтва неапраўдана мала плаціць за камунальныя паслугі, якія прадастаўляюцца дзяржавай, — лічыць Аляксандр Ярашэнка. — Гэтая лічба складае каля 24%. У наступным годзе мы разлічваем з улікам павышэння рэальных даходаў насельніцтва павысіць пакрыццё насельніцтвам расходаў на жыллёва-камунальныя паслугі да 35%.

Інфляцыя за 2014 год, па разліках, павінна скласці 11%.

**Святлана БУСЬКО.**

ФАКТЫ

## З РАСКЛАДУ ЗДЫМАЮЦЦА ПАЯЗДЫ

**У сувязі са зніжэннем пасажырапатоку з 15 лістапада з раскладу руху знікнуць некалькі паяздоў рэгіянальных ліній эканом-класа.**

Як паведамілі ва ўнітарным прадпрыемстве «Мінскае аддзяленне Беларускай чыгункі», на ўчастку Мінск — Маладзечна гэта будуць паязды: Мінск — Аляхновічы — Мінск адпраўленнем з прыпыначнага пункта Мінск-Паўночны ў 8.20 (адпраўленнем з Аляхновічаў у 10.00) — па суботах і нядзелях; Мінск — Аляхновічы — Мінск, што выходзіць з таго ж прыпыначнага пункта ў 10.00 (з Аляхновічаў — у 12.30) — таксама па суботах і нядзелях; Мінск — Аляхновічы — Мінск адпраўленнем са станцыі Мінск-Пасажырскі ў 14.06 (адпраўленнем з Аляхновічаў у 15.51) — па суботах і нядзелях; Мінск — Аляхновічы — Мінск, што выходзіць з прыпыначнага пункта Мінск-Паўночны ў 16.56 (з Аляхновічаў — у 19.09) — па пятніцах, суботах і нядзелях.

На ўчастку Орша — Лепель здымаецца з раскладу поезд Орша — Лепель — Орша адпраўленнем са станцыі Орша-Цэнтральная ў 13.41 (са станцыі Лепель — у 18.15) — па суботах і нядзелях.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## НОВЫ МАТЫЛЁК

**Сёння Нацыянальны банк уводзіць у абарачэнне сярэбраную памятную манету «Пераліўніца вялікая (Apatura iris)» серыі «Матылькі», паведамляе ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацбанка.**

Манета мае намінал 20 рублёў, пробу сплаву 925, масу 28,28 грама, дыяметр 38,61 міліметра. Адчаканена на Манетным двары Польшчы якасцю «пруф». Тыраж — да 8000 штук.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

■ На слыху

## СТАЎКА ДЗЯРЖПОШЛІНЫ НА АЎТАМАБІЛІ — АД 1 ДА 25 БАЗАВЫХ ВЕЛІЧЫНЬ

**Стаўка дзяржпошліны за допуск аўтамабіля да дарожнага руху ў залежнасці ад яго масы, віду і ўладальніка будзе складаць ад 1 да 25 базавых велічынь (1 базавая складае Br130 тыс.). Аб гэтым паведаміў учора намеснік міністра фінансаў Максім Ермаловіч на пашыраным сумесным пасяджэнні пастаянных камісій Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы і па бюджэце і фінансах, перадае БЕЛТА.**

«Сярод новаўвядзенняў 2014 года — увядзенне так званага транспартнага падатку, дакладней, гэта дзяржаўная пошліна за допуск транспартнага сродку да ўдзелу ў дарожным руху», — адзначыў Максім Ермаловіч. Стаўкі дзяржпошліны будуць устаноўлены ў памеры ад 1 да 25 базавых велічынь



у залежнасці ад масы і віду транспартнага сродку, а таксама таго, хто ім валодае — фізічная або юрыдычная асоба. Спаганяцца пошліна для спрашчэння адміністравання будзе ў час праходжання тэхагляду транспартнага сродку. «За кошт увядзення такой дзяржаўнай пошліны мы плануем атрымаць каля Br1 трлн. Гэта пошліна будзе залічвацца ў рэспубліканскі бюджэт», — паведаміў намеснік міністра.

## У П'ЯНАГА МІНЧАНІНА КАНФІСКАВАЛІ FIAT

**Першае рашэнне аб канфіскацыі аўтамабіля за «п'янае кіраванне» 13 лістапада вынес суд Першамайскага раёна Мінска.**

На лаву падсудных трапіў 28-гадовы кіроўца FIAT, які раней прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за незаконны абарот моцнадзейных ці атрутных рэчываў. Яго спынілі на МКАД 27 кастрычніка. У крыві маладога чалавека выявілі 1 праміле алкаголю. Як паведамілі ў АДАІ Першамайскага РУУС Мінска, упершыню за кіраванне ў нецвярозым стане яго аштрафавалі і пазбавілі правоў 14 кастрычніка гэтага года.

На гэты раз суд прызначыў маладому чалавеку пакаранне ў выглядзе 1 года і 6 месяцаў папраўчых работ з утрыманнем 20% заробку ў бюджэт штомесяц, штраф 300 базавых велічынь (39 млн рублёў), пазбавіў правоў на тры гады і канфіскаваў аўтамабіль, за рулём якога знаходзіўся абвінавачаны. Дарэчы, FIAT, які фактычна належаў 28-гадоваму мінчаніну, зарэгістраваны на іншага чалавека. Але як адзначыла старшыня суда Першамайскага раёна Мінска Тамара Высоцкая, для суда не мае прававога значэння прыналежнасць транспартнага сродку. Зараз FIAT знаходзіцца на штрафстаянцы. Прысуд у законную сілу не ўступіў і можа быць абскарджаны на працягу 10 дзён.

Нагадаем, што закон аб канфіскацыі аўтамабіля, на якім п'яны кіроўца папаўся ў другі раз за год, уступіў у сілу 24 кастрычніка гэтага года. Цяпер суд мае поўнае права, згодна з арт. 317 прым. Крымінальнага кодэкса, канфіскаваць аўтамабіль, на якім было здзейснена гэтае злачынства (незалежна ад таго, каму ён належыць, за выключэннем выпадкаў згону).

**Надзея ДРЫЛА.**

# КІРОЎЦЫ ПАВІННЫ «ПАСЯБРАВАЦЬ» З ЭЛЕКТРОНІКАЙ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Часта да парушэнняў прыводзіць невыкананне карыстальнікам патрабаванняў да ўстаноўкі бартавых прылад на транспартным сродку, хоць гэтыя патрабаванні прапісаны ў інструкцыях карыстальнікаў. Да парушэнняў прыводзіць няўважлівасць да гукавых і светлавых сігналаў, якія выдаюць прылады падчас руху па платных дарогах, невыкананне карыстальнікам умоў дагавора аб карыстанні сеткай платных дарог. Як дадаў Сяргей Буры, у выключных выпадках парушэнні могуць быць абумоўлены збоямі ў працы сістэмы BelToll, што было зафіксавана толькі некалькі разоў за ўвесь тэрмін эксплуатацыі.

### БОЛЬШАСЦЬ ПАРУШАЛЬНІКАЎ — РЭЗІДЭНТЫ КРАІНЫ

На 12 лістапада, адпаведнымі службамі было складзена каля 56 тысяч актаў аб парушэннях платы за праезд па аўтадарогах Беларусі. Намеснік начальніка Транспартнай інспекцыі Міністэрства транспарту і камунікацый Аляксей Куцаеў паведаміў, што рэзідэнтам Беларусі за гэты час было адпраўлена каля 35 тысяч актаў з патрабаваннем унясення платы. У дачыненні да нерэзідэнтаў складзена прыкладна 21 тысяча актаў. Гэта парушэнні, па якіх былі прыняты пэўныя меры. Рэзідэнтам накіравана патрабаванне аб унясенні платы ў павялічаным памеры. Нерэзідэнты ў большасці выпадкаў ужо ажыццявілі аплату, бо ў іх ёсць права аплаты на месцы. Трэба адзначыць, што кожны ліст для рэзідэнтаў фіксуе асобнае парушэнне. Пры гэтым у акце для нерэзідэнтаў можа змяшчацца як адно, так і ўсе парушэнні, якія былі выяўлены па пэўным транспартным сродку.

Асобна Аляксей Куцаеў адзначыў, што тэрмін складання акта, у адрозненне ад адміністрацыйнага працэсу, не прадугледжаны. Ён рэгулюецца грамадзянскім заканадаўствам, калі парушальніка штраф можа «шукаць» мінімум тры гады. Інспекцыя мае права вылучыць патрабаванне ўнесці аплату ў павялічаным памеры ў гэты перыяд. На першым этапе запуску і функцыянавання сістэмы ў суткі выяўлялася 2,5-3 тыс. парушэнняў. Таму тэхнічнай і фізічнай магчымасці тады для аператыўнага афармлення падобнай дакументацыі не было. Цяпер спецыялісты інспекцыі могуць апрацоўваць і адпраўляць 1,3 тысячы падобных лістоў у дзень. А вось да канца лістапада плануецца скараціць час апрацоўкі даных і напраўлення апавяшчэння на ўнясенне платы ў павялічаным памеры, да аднаго дня. Разам з тым, Аляксей Куцаеў падкрэсліў, што, робячы такія прагнозы, варта ўлічваць мноства фактараў, у тым ліку і колькасць зафіксаваных парушэнняў.

**ДАВЕДКА**

**Тарыфы за перамяшчэнне па беларускіх аўтамагістралях устаноўлены ў залежнасці ад тэхнічна дапушчальнай агульнай масы транспартнага сродку і колькасці восяў і складаюць ад 0,04 еўра да 0,12 еўра за кіламетр.**

### НЕЗАКОННЫ ШТРАФ АДМЕНЯЦЬ, А ГРОШЫ ВЕРНУЦЬ

— Да 1 лістапада кампанія сістэмы атрымала каля 3,6 тысячы прэтэнзій у дачыненні да збірання платы ў павялічаным памеры. Колькасць прэтэнзій у лістападзе пайшла на спад, — паведаміў **намеснік старшыні Дырэкцыі па камерцыйнай эксплуатацыі кампаніі-аператара сістэмы BelToll Дзмітрый МАЗАНІК.** Прыкладна 80% парушэнняў кіроўцамі парадку аплаты за праезд былі пацверджаны на тэхнічным узроўні. А ў 20% выпадкаў, калі парушэнне аплаты праезду адбылося з-за тэхнічнага збою ў сістэме, у Транспартную інспекцыю накіроўвалася экспертнае заключэнне, на падставе якога інспекцыя можа адмяняць штрафы ці вярнуць грошы. Ужо цяпер кіроўцам вернута больш за 20 тысяч еўра.

У цэлым ад рэзідэнтаў і нерэзідэнтаў у бюджэт ужо пастуціла каля 4 млн еўра ў якасці платы за праезд у павялічаным памеры. Як паведаміў намеснік начальніка Транспартнай інспекцыі Міністэрства транспарту і камунікацый Аляксей Куцаеў, зафіксаваны выпадкі, калі плату ў павялічаным памеры і пошліну ў памеры 50% ад гэтай платы бралі ад парушальнікаў праз суд.



**Карта платных дарог Беларусі.**

Паводле слоў Дзмітрыя Мазаніка, з першых дзён эксплуатацыі сістэмы карыстальнікам выдадзена 140 тысяч бартавых прылад. Усяго, згодна з інвестдагаворам, у Беларусь завезена каля 400 тысяч прылад, і гэтай колькасці цалкам дастаткова, упэўнены спецыялісты кампаніі. Акрамя таго, работнікі сістэмы ў анлайн-рэжыме адсочваюць колькасць прылад у кожным пункце абслугоўвання кліентаў. У Беларусі на пачатак камерцыйнай эксплуатацыі BelToll было адкрыта 48 пунктаў абслугоўвання кліентаў, абсталяваны два сучасныя цэнтры апрацоўкі інфармацыі.

### РАСПРАЦОЎВАЕЦЦА ПРАГРАМА ПА ДАДАТКОВЫМ ІНФАРМАВАННІ

— У сувязі з тым, што ў наступным годзе ў Беларусі будзе праходзіць чэмпіянат свету па хакеі, прынята рашэнне, у адпаведнасці з якім кампанія сумесна з Мінтрансам распрацоўвае праграму па дадатковым інфармаванні ўсіх катэгорый уладальнікаў транспартных сродкаў аб нюансах дзейнасці сістэмы, — паведаміў менеджар па маркетынгу і сувязях з грамадскасцю кампаніі-аператара сістэмы BelToll Сяргей Буры.

Праграма будзе ўключаць інфармаванне ў пунктах перасячэння мяжы, устаноўку стэндаў, распаўсюджванне друкаванай прадукцыі. Непасрэдна ў пунктах пропуску будзе размешчана вонкавая рэклама. Па словах Сяргея Бурага, новыя інфармацыйныя матэрыялы ў першую чаргу будуць разлічаны на турыстаў, якія прыедуць на чэмпіянат. Аднак інфармацыйная кампанія будзе працягвацца і пасля спартыўнага форуму. Усе ўстаноўленыя сродкі вонкавай рэкламы будуць намі эксплуатавацца і падтрымлівацца за кошт сродкаў аператара і інвестыцыйнага бюджэту.

**ДА ВЕДАМА**

**Каб сістэма збору электронных плацяжоў працавала на аўтамабілях з металізаваным лабавым шклом, на іх павінна быць ўсталявана бартавая прылада з вонкавай антэнай. У гэтым выпадку бартавая прылада і антэна ўпакаваны ў адну каробку і злучаюцца паміж сабой спецыяльным кабелем.**

**Плата за перамяшчэнне па беларускіх аўтамагістралях прадугледжана для любых транспартных сродкаў масай больш за 3,5 тоны, у тым ліку і цяжкіх джыпаў. Не дапускаецца пераўсталёўка бартавых прылад на іншыя транспартныя сродкі.**

Электронная сістэма збору платы за праезд BelToll заснавана на выкарыстанні тэхналогіі спецыялізаванай радыёсувязі на кароткіх адлегласцях і дазваляе спаганяць зборы з карыстальнікаў дарогі без спынення транспартных сродкаў. Яе камерцыйная эксплуатацыя пачалася ў Беларусі з 1 жніўня. Цяпер сістэма ахоплівае 815 км беларускіх дарог. Работы па пашырэнні сеткі вядуцца на ўчастках рэспубліканскіх аўтамагістраляў М4 (Мінск — Магілёў) і М5 (Мінск — Гомель).

У адпаведнасці з Указам № 426 ад 27 верасня 2012 года, ад дарожных збораў вызваляюцца транспартныя сродкі, зарэгістраваныя на тэрыторыі краін Мытнага саюза, з тэхнічна дапушчальнай агульнай масай не больш за 3,5 т. Бясплатна могуць праехаць мапеды і матацыклы, зарэгістраваныя ў Беларусі, колавыя трактары і самаходныя машыны, транспартныя сродкі аператыўнага прызначэння, а таксама транспарт, што выкарыстоўваецца ў мэтах забеспячэння абароназдольнасці і правапарадку. Не трэба плаціць кіроўцам маршрутак для гарадскіх перавозак пасажыраў, аўтамабіляў, якія выкарыстоўваюцца для аказання меддапамогі, ліквідацыі надзвычайных сітуацый або перавозак грузаў гуманітарнай дапамогі насельніцтву Беларусі і іншых краін.

Уладальнікам электроннай сістэмы збору платы за праезд па аўтатрасах з'яўляецца ДУ «Белаўтастрада». Кіруе працай BelToll у Беларусі кампанія-аператар «Капш Тэлематыка Сэрвісіз». Кантралюе спагнанне збораў на платных аўтамагістралях Транспартная інспекцыя.

**Сяргей КУРКАЧ.**

26 ноября 2013 г. в 10.30 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Брестский КСМ».

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об изменении размера уставного фонда Общества.
2. О внесении и утверждении изменений в Устав Общества.

Местонахождение ОАО «Брестский КСМ»: г. Брест, ул. Гоздецкого, 28.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Гоздецкого, 28.

Время регистрации в день проведения собрания с 10.00 до 10.30.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 19.11.2013 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения Общества.

Совет директоров.

УНП 200295903

■ Медыяперсона

## Дзмітрый ШУНІН:

# «У ЭФІРЫ І Ў ГУМАРЫ ВАЖНА ЎМЕЦЬ УСЁ ПРАЛІЧВАЦЬ»

**Папулярнае шоу «Рассмяшы коміка» пашырае сваю геаграфію. З 17 лістапада яно стартуе ў эфіры канала АНТ. Вядучымі будуць расійскі акцёр і камедыянт Віктар Васільеў і папулярны беларускі тэлевядучы і шоумэн Дзмітрый Шунін. Апошні — па жыцці аптыміст, але часам бывае сентыментальным. Інтуітыўна ўмее пазнаваць людзей, якія з ім на адной хвалі. Любіць музыку, гумар і «жыццё ў эфіры».**
**Мы сустрэліся з Дзмітрыем, каб пагаварыць пра яго ўражанні ад шоу, матэматыку ў жартах і кар'ерныя ўзлёты і падзенні.**



***— Якія ўражанні засталіся ад здымак шоу «Рассмяшы коміка»?***

— Найперш станоўчыя эмоцыі. Я быў проста ў захапленні ад працы здымачнай групы і самой атмасферы, якая панавала на пляцоўцы. Адзінае, я, мабыць, як і гледачы буду глядзець праграму ў першы раз, бо мая праца праходзіла за кулісамі. Не давялося пачуць нічога з таго, што адбывалася на сцэне. Я размаўляў з удзельнікамі, але не ведаю, як яны паказвалі сябе перад суддзямі. Чуў толькі выбухі смеху і гук сігналу, калі комікі смяяліся і чалавек зарабляў грошы. Трэба заўважыць, народ трохі спустошыў сейф комікаў. Але прыемна, што ўсе былі ў роўных умовах. Я размаўляў з кожным удзельнікам да таго, як яны выходзілі на сцэну, і пасля таго, як вярталіся. Тыя, каму ўдавалася выйграць, радаваліся, знаходзіліся ў стане эйфарыі: ім жа ўдалося «зачапіць» сваімі жартамі. А вось тыя, хто вяртаўся ні з чым, зразумела, былі сумнымі.

***— Ваш сувядучы па шоу Віктар Васільеў неяк сказаў: «Гумар — гэта матэматыка». Вы згодны з такім вызначэннем?***

— Матэматыка ляжыць у аснове ўсяго. Як і сам гумар. Бывае, што жарты не вельмі моцныя, а варта іх расставіць у патрэбнай паслядоўнасці, каб у пэўны момант прагучаў той, што да месца, — і чуеш смех у зале. Калі падрыхтаваць глебу для жарту, то яго правільна і ўспрымуць. Як кажуць КВЗшнікі, чалавека складана рассмяшыць адным жартам. Існуе пэўная тактыка іх «накідвання». Здараецца ж, раскажаш чалавеку нешта смешнае, а ён не ўсміхнецца нават. Таму важна ўмець пралічваць.

***— Чаму, на ваш погляд, шоу талентаў «Рассмяшы коміка» карыстаецца такой папулярнасцю?***

— Канкурсанты праходзяць адбор. І калі трапляюць у праграму, значыць, чымсьці яны зацікавілі рэдактарскую групу, якая палічыла, што чалавек можа сябе паказаць. Ёсць, безумоўна, і фрыкі розныя, але тыя прыходзяць падурэць. Гумар — гэта поле неаранае. Бо праграмы фармату «Крывое люстэрка» ўжо састарэлі, а «Comedi Club», «КВЗ» — праекты самабытныя, дзе спецыфічны гумар. Таму добра, што існуе выбар для гледача і ідзе пошук новых імёнаў у гэтай сферы.

***— Вы працуеце на радыё і на тэлебачанні ў фармаце забаўляльнага шоу. Ці не ўзнікала жадання паспрабаваць сябе ў сур'ёзным жанры?***

— Шчыра кажучы, не. Па-першае, у мяне не хапае на гэта часу; па-другое, у такіх праектах я не зацікаўлены. Сур'ёзныя праграмы вядуць сур'ёзныя людзі, а я па натуры лёгкі чалавек. Я нават навіны ў розных сферах адсочваю толькі збольшага, а не так, каб сядзець кожны дзень і шукаць у прэсе, што і дзе адбылося.

**Гумар — гэта поле неаранае. Бо праграмы фармату «Крывое люстэрка» ўжо састарэлі, а «Comedi Club», «КВЗ» — праекты самабытныя, дзе спецыфічны гумар. Таму добра, што існуе выбар для гледача і ідзе пошук новых імёнаў.**

***— А чым цікавіцеся па жыцці?***

— Музыкай. Грампласцінкі збіраю. Не лічыў, праўда, колькі іх. У асноўным там цяжкая музыка. Таксама на канцэрты езджу. Словам, стараюся трымаць руку на пульсе музычных навінак.

***— Што ў вашым асабістым плэй-лісце?***

— Для мяне ў музыцы галоўнае — мелодыя. Апошнім часам у мяне гучаць новыя альбомы груп «Motorhead» і «Dream Theatre». Таксама магу слухаць блюз, рок, джаз. Нядаўна сябар запісаў мне падборку фанка 1970-х.

***— Дыджэй на радыё можа сёння ўплываць на тое, якая музыка трапляе ў эфір?***

— Зараз усё камп'ютарызавана. Палітыка эфіру — таксама матэматыка, якой займаецца музычны рэдактар. Менавіта ён вырашае, якія кампазіцыі ставіць, у які час і з якой мэтай. Тут працуюць даволі строгія правілы. Раніцай гучыць адна музыка, днём — другая, а вечар патрабуе трэцяй. Адзінае, я магу запрапанаваць музычнаму рэдактару нейкі матэрыял, а ён ужо вырашыць, ці трапіць кампазіцыя ў эфір. Ёсць правіла радыйшчыка: калі не падабаецца музыка, якая гучыць на хвалі, то слухай сваю, але дома. А на радыё рашэнні павінен прымаць чалавек, які ведае спецыфіку і палітыку радыёстанцыі.

***— Чым вас прываблівае праца на радыё?***

— У адрозненне ад тэлебачання, радыё не ставіць рамак адносна таго, што і як трэба рабіць. На радыё больш свабодная форма рэалізацыі сябе. Там я асабіста вырашаю, які тэкст прагаворваю і ў якой ступені прытрымліваюся сцэнарыя. На тэлебачанні такія адступленні немагчымыя, бо ў залежнасці ад таго, што вядучы кажа, адпаведная «карцінка» з'яўляецца на экране. Калі ж сам можаш рэгуляваць сітуацыю, то ўсё значна прасцей. Безумоўна, ёсць табу, але ў астатнім у лёгкай форме ты можаш гаварыць пра ўсё. І за доўгі час я прывык да гэтага, аднак галоўнае, што ад сваёй працы я атрымліваю задавальненне. Інакш мне проста было б нецікава.

***— На радыё АНТ у «Шарман шоу» вы працуеце ў тандэме з Ганнай Шалюцінай. Гэта мае свае перавагі?***

— Для мяне існуюць плюсы як у сольнай, так і ў сумеснай працы ў эфіры. Аднак праца ў тандэме больш прываблівае. Калі ты адзін, то выказваеш толькі ўласнае меркаванне, а ўдваіх ёсць магчымасць дыялогу. Не мае істотнай розніцы, працаваць у пары з мужчынам ці з жанчынай, таму што самае важнае — проста быць на адной хвалі, з блізкім успрыманнем гумару. Зразумела, ёсць пэўныя рэчы, якія з жанчынай не абмяркуеш, але, можа, тады і на абмеркаванне слухачоў іх выносіць не трэба. Мне з жанчынай цікавей у эфіры, бо прысутнічае бачанне жыцця з улікам розных умоў існавання ў соцыуме. А канфліктныя сітуацыі часцей за ўсё ўзнікаюць, калі інтарэсы і характары розняцца. Заўсёды ж хочацца весці дыялог з тым, хто можа падтрымаць размову.

**Ёсць правіла радыйшчыка: калі не падабаецца музыка, якая гучыць на хвалі, то слухай сваю, але дома. А на радыё рашэнні павінен прымаць чалавек, які ведае спецыфіку і палітыку радыёстанцыі.**

***— Перад эфірам вам трэба настройваць сябе на пазітыўны лад?***

— У мяне гэта аўтаматычна адбываецца тады, калі я прыходжу на радыё. Бо разумею, што павінен быць пазітыўным. Нават калі ў мяне дрэнны настрой ці нешта не ладзіцца, то нейкі тумблер унутры пераключаецца ў рэжым «на працы». Нікому, па вялікім рахунку, не цікава, якія ў цябе праблемы. Хочаш сумаваць — сядзі дома, а тут «іграй» запланаваную ролю.

***— Кажуць, калі чалавек жартуе ў эфіры, то гэта зусім не азначае, быццам ён весяльчак па жыцці. Гэта не пра вас?***

— Я заўсёды імкнуся быць пазітыўным. Але, разам з тым, я бываю сентыментальным і многія рэчы могуць мяне засмуціць. Як і любому нармальнаму чалавеку, мне непрыемна, калі сутыкаюся з грубасцю, хамствам. Сумна бывае нават ад дажджлівага надвор'я.

***— У ацэнцы сваёй працы для вас больш важна чуць пахвалу ці крытыку?***

— Лічу, што і тое, і другое прыносіць карысць. Бо, калі глядзіш на нешта збоку, лепш бачыш станоўчае і адмоўнае. Крытыку ўспрымаю заўсёды цвяроза і ацэньваю яе змест: дзе і што трэба перагледзець, бо і я магу памыляцца. Аднак таксама трэба разумець, што ў ацэнцы часам пераважае суб'ектыўнае ўспрыманне. І тады, пры ўмове, калі, скажам, аднаму чалавеку не спадабалася, а тысяча засталася задаволенай, ты ўжо выбіраеш, чыё меркаванне цябе больш цікавіць. Незадаволеныя будуць заўсёды.

***— А як ставіцеся да зайздрасці і «зорнай хваробы»?***

— Людзі зайздрослівыя па сваёй прыродзе, але, мне здаецца, сярод маіх знаёмых такія адсутнічаюць. Калі ўзнікаюць сумненні наконт таго, з якой прычыны чалавек са мной кантактуе, то стараюся зусім не мець з ім стасункаў. А ў дачыненні да асабістага поспеху я досыць стабільны. За пятнаццаць гадоў маёй працы на радыё і тэлебачанні здараліся стадыі ўзлётаў і падзенняў, і мне вядомы стан арганізма і мозга ў кожнай з іх. Я для сябе знайшоў сярэдні ўзровень. І, гледзячы на некаторых людзей у стадыі поспеху, я разумею: яны не думаюць пра тое, што пасля ўзлёту ёсць яшчэ турбулентнасць, паветраныя ямы і падзенні. Складана патлумачыць ім гэта, дый я не імкнуся тое рабіць.

**Алена ДРАПКО**

■ Чулі?

# НА «ЕЎРАБАЧАННЕ» АД БЕЛАРУСІ ПАЕДЗЕ САЛАДУХА?

**Па інтэрнэце ваўсю гуляе прома-ролік з Аляксандрам Саладухам, зняты арганізатарамі нацыянальнага адборачнага тура на «Еўрабачанне». З гітарай і самбрэра, з вогненным надпісам «Eurovision» на патыліцы, спявак строга звяртаецца з экранаў да айчынных выканаўцаў: «А ты падаў заяўку?» Адразу папаўзлі чуткі, што насамрэч гэта схаваны PR Саладухі, які і сам збіраецца налета паехаць на конкурс... Каб праверыць чуткі сарафаннага радыё, мы патэлефанавалі самому артысту.**

— Сапраўды кажуць, што я збіраюся ўдзельнічаць у адборы? Ну, пажывём — пабачым, — ухіліўся ад прамога адказу артыст. — Вам ролік спадабаўся?

— Шчыра кажучы, нечаканы вобраз. Усе прызвычаіліся, што вы пастаянна ў гуморы і з усмешкай, а тут строгі такі, быццам з плаката «Ты запісаўся ў дабравольцы?».

— Такая і была задумка, прапанаваная карэспандэнтам «Беларусь1» Анжалікай Бортнік, — рассмяяўся Аляксандр. — Да таго ж мы здымалі пасля 3 дзён гастроляў, ноччу, усе вельмі стомленыя... І гэта не адзіны ролік — далей будзе цікавей. На наступным тыдні з'явіцца яшчэ адзін прома-ролік, які, думаю, выкліча не меншы рэзананс. А яшчэ 18 лістапада я буду ў прамым эфіры «Добрай раніцы, Беларусь!». Там сёе-тое і раскажу.



Дарэчы, Аляксандр Саладуха рабіў ужо спробу прабіцца на «Еўрабачанне» — амаль 10 гадоў таму, у 2004-м, калі наша краіна ўпершыню далучылася да конкурсу ў якасці ўдзельніцы. Многія заўзятары дагэтуль памятаюць яго палымяны заклік «Take it easy gay!» (у рускамоўным варыянце — «Не перажывай!»). Канкурэнцыю яму, што адметна, складаў сярод іншых Максім Сапацькоў, які сёлета пад іменем Макса Лорэнса разам з вядомым гітарыстам ДзіДзюЛем абвясціў аб сваім намеры зноў падаць заяўку на «Еўрабачанне».

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

■ Тэлесеткі

## ДЗЕ «НАСЛЯДЗІЛІ» АПОСТАЛЫ?



**Аб гэтым распавядае адзін з самых паспяховых беларускіх серыялаў сучаснасці.**

Вострасюжэтны серыял «Сляды апосталаў» ствараўся сіламі кінастудыі «Беларусьфільм» і тэлеканала АНТ паводле легенды аб скарбах роду Радзівілаў — залатых статуэтках 12 Залатых апосталаў, нібыта схаваных у сутарэннях Нясвіжскага палаца. У серыяле падзеі 1942 года ў Берліне і ў Нясвіжы пераплятаюцца з сучаснасцю, містыка — з рэальнымі фактамі...

Што адметна (і рэдка па сённяшнім часе), здымалі яго без прыцягнення замежных рэсурсаў, уласнымі сіламі — і сцэнарый, і падбор акцёраў. (Галоўныя ролі выканалі беларускія акцёры Вераніка Пляшкевіч, Таццяна Мархель, Павел Харланчук, Ігар Сігоў, Дзмітрый Мухін, Алег Гарбуз.) Праўда, прэм'ера адбылася ўсё ж у Расіі — на канале «РТР», які першым выкупіў правы на трансляцыю. «Затое мы падрыхтавалі для гледачоў у якасці дадатку да поўнай версіі «Слядоў апосталаў» прыемны бонус — своеасаблівую прадмову ад удзельнікаў здымак, а таксама пасляслоўе аб самым цікавым, што засталося за кадрам, — адзначае прэс-сакратар тэлеканала АНТ Юлія Дубоўская. — І паверце, гэтага яшчэ ні разу не паказвалі ні ў кінатэатрах, ні ў тэлеэфіры, толькі эксклюзіўна на АНТ».

**Дзе:** *АНТ і інтэрнэт-канал ont.by.*
**Калі:** *20 і 21 лістапада, 21.05.*

## ЯКІ ЧАС — ТАКІЯ ПЕСНІ

**Тэлеканал АНТ пакажа эксклюзіўную трансляцыю канцэрта новай «зоркі» беларускага шоу-бізнесу.**

Пра феномен простага лунінецкага хлопца Макса Каржа, які за апошні год «парваў» беларускую і расійскую аўдыторыю, не згадваў толькі лянівы. Самародны талент альбо прадуманая праца прадзюсараў, новы герой пакалення ці тыповы прадукт музычных тэлеканалаў? Дзіды спрачальнікаў ломяцца, мноства пытанняў так і лунаюць у паветры, а тым часам выканаўца першым і пакуль што адзіным з беларускіх артыстаў «узяў» найвялікшую айчынную канцэртную пляцоўку — «Мінск-Арэну».

Дагэтуль на «Мінск-Арэне» выступалі хіба замежныя артысты высокага палёту: Джэніфер Лопес, Мілен Фармер, Rammstein, Шакіра, Depeche Mode, Стынг... Аўтар і выканаўца з Лунінца, сабраўшы поўную залу фанатаў — 13 тысяч чалавек, даказаў, што падобнае па сілах і беларусам. Тыя ж, каму не хапіла білетаў на канцэрт 2 лістапада, роўна як і ўсе тыя, хто задаецца лагічным пытаннем, хто такі наогул Макс Корж і чаму ад яго захоплена вішчаць дзяўчаты, змогуць расставіць для сябе ўсе кропкі над «і», паглядзеўшы эксклюзіўную тэлеверсію гэтага выступлення. Ацэньвайце рытмы і тэксты, вызначайцеся з уласнымі сімпатыямі і антыпатыямі, вырашайце, ці ваша гэта музыка — урэшце, спрачацца наконт смаку вустрыц варта, хоць аднойчы іх пакаштаваўшы.

**Калі:** *18 лістапада ў 21.05.*
**Дзе:** *АНТ.*

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

■ Медыяпрастора

| | | | |
|---|---|---|---|
| Брэст | 106.6 FM | Бабруйск | 103.6 FM |
| Віцебск | 101.8 FM | Баранавічы | 98.4 FM |
| Мінск | 107.1 FM | Салігорск | 104.3 FM |
| Гродна | 104.2 FM | Пінск | 103.2 FM |
| Магілёў | 107.8 FM | | |

## «У БАРДАЧОК»

Як зрабіць язду ў тумане бяспечнай і чым у такіх умовах надвор'я могуць дапамагчы шклоачышчальнікі? Калі надыходзіць пара мяняць на аўтамабілі шыны? Чым могуць быць небяспечныя сельскагаспадарчыя машыны і што варта ўлічваць пры сустрэчы з імі на дарозе? Як не заснуць за рулём? Што, акрамя кавы, энергетычных напояў і гучнай музыкі, зможа дапамагчы даехаць да месца начлегу?

Пра ўсё гэта вы можаце даведацца ў аўтарскай рубрыцы Аляксея Аніковіча «У бардачок», якая штодзённа выходзіць на радыё «Мір». «У бардачок» — рубрыка аб аўтамабілях і для аўтамабілістаў. У апошніх часта ўзнікае шмат пытанняў, адказы на якія не заўсёды даюць у аўташколах. Напрыклад, запацелыя знутры шкло аўтамабіля можна лёгка «высушыць», калі ўключыць кандыцыянер і печку. Тады ў салоне заўсёды будзе сухое і цёплае паветра. А што рабіць тым, у каго няма ў машыне кандыцыянера?

Адказ на гэтае і многія іншыя пытанні можна пачуць па буднях у 08:45, 13:15 і 18:45 на радыё «Мір». У гэты час вядучы Аляксей Аніковіч паведаміць пра ўсе нюансы бяспечнага і камфортнага перамяшчэння ў аўтамабілі. Таксама вы пачуеце рэкамендацыі ДАІ, апошнія навіны аўтасвету, у тым ліку і паведамленні пра кур'ёзныя сітуацыі на дарогах. І ўсё гэта ў праграме «У бардачок» на хвалях радыё «Мір».

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## ПАНЯДЗЕЛАК, 18 ЛІСТАПАДА

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.15** Навіны.
**7.05, 8.05** Дзелавое жыццё.
**7.10, 8.10, 19.40, 22.55** Зона Х.
**9.10** У цэнтры ўвагі.
**10.00 Драма «Сола на саксафоне».**
**12.10** Дзень у вялікім горадзе.
**13.20** Клуб рэдактараў.
**14.10** Вакол планеты.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25** Журналісцкае расследаванне.
**15.55** Заўтра — гэта мы!
**16.25** Усё як трэба!
**16.50 Меладрама «Васількі для Васілісы».**
**19.20** Арэна.
**19.55** Форум.
**21.00** Панарама.
**21.45 Дэтэктыў «Шулер». 1-я серыя.**
**23.30** Дзень спорту.
**23.45 Баявік «Прафесіянал».**

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 21.20** Тэлебарометр.
**9.05, 17.55 Серыял «Двое з куфэрка».**
**10.10** Навіны надвор'я.
**10.50, 0.05 Серыял «Следства вядзе Да Вінчы».**
**12.00** «Пад грыфам «Вядомыя».
**12.35 Фільм — дзецям «Незвычайныя прыгоды Карыка і Валі».**
**14.50 Баявік «Механік».**
**16.40** Беларуская часінка.
**18.55 Меладрама «Больш, чым каханне».**
**21.25** КЕНО.
**21.30 Серыял «Інтэрны».**
**23.05 Серыял «Рэальныя хлопцы».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.30** «Дабраранак».
**8.00, 12.15, 19.10, 0.10** «Калейдаскоп».
**8.05, 12.20, 0.20** «Год у гісторыі».
**8.20** «Аляксандр Мядзведзь». Чалавек-легенда. Дак. фільм.
**8.55** «Лабірынты». Край за небакраем. Гісторыя мястэчка Сапоцкін.
**9.20** «Росчырк часу». Брэсцкія кавалі.
**9.35, 22.25 «Раскол». Маст. фільм.**
**10.25, 22.00** «Дыя@блог». «Пра мову».
**10.55 «Трактарысты». Маст. фільм.**
**12.35, 23.45** «Святло далёкай зоркі».
**13.05, 23.20** «Аўтограф».
**13.30** «Адступнік». Дак. фільм.
**14.00** «Цуды прыроды». Лаос. Ісландыя.
**14.25** «Палескі пачастунак». Кулага і фаршыраваная бульба.
**14.40** «На беразе ракі Фантанкі». Дак. фільм.
**15.15 «Крыж на зямлі і поўня ў небе». Маст. фільм.**
**16.40** «Наперад у мінулае».
**17.10** «Камертон». Дзмітрый Салярцінскі.
**17.35** «Сінематэка». Факультэт экранных мастацтваў.
**18.20** «Скарбніца Берасцейшчыны». Старажытнае Бярэсце.
**18.50** «Аляксей Саўрасаў». Дак. фільм.
**19.20 «Падкідыш». Маст. фільм.**
**20.30** Калыханка.
**20.50 «Магіла льва». Маст. фільм.**

### БЕЛАРУСЬ 5

**8.05** Баскетбол. Ліга ВТБ. «Цмокі-Мінск» — Астана.
**9.45** Хакей. КХЛ. «Нафтахімік» — «Дынама» (Мінск)
**11.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**12.10, 14.30** Футбол. Чэмпіянат свету. (U-20). 1/8 фіналу.
**14.00** Дак. фільм «Нашы». Спартак Мірановіч.
**16.25** Футбол. Кубак Канфедэрацый. Фінал. Бразілія — Іспанія.
**18.10** Фактар сілы.
**18.40** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Нёман» (Гродна) — ХК Віцебск.
**21.25** Авертайм.
**21.55** Гандбол. Чэмпіянат свету-2013. Польшча — Беларусь.
**23.20** Мастацкая гімнастыка. Шоу зорак.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.05** «Жыць здорава!».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10 Серыял «Закрытая школа».**
**12.10** «Самы лепшы муж».
**13.10** Добрага здаровейка!.
**13.55** «Модны прыгавор».
**15.00** «Сам-насам з усімі».
**16.15** «Зразумець. Дараваць».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.20** «Адваротны адлік». «Графская прыстань. Партрэт невядомай».
**19.00** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05** Ток-шоу «Пазіцыя».
**22.05** «Жыць у кайф». Канцэрт Макса Каржа.
**23.30 Трылер «Омен».**
**1.30** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.40** «Вялікае снеданне».
**10.20** «Далёкія сваякі».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.35** «Такі лёс».
**12.30** «Джэймі: у пошуках смаку».
**13.00** Рэпарцёрскія гісторыі.
**13.50** «Вялікі горад».
**14.30** «Зорны рынг. Новы сезон. Бітва кавер-бэндаў». «Baron Band» супраць «Artefact».
**15.45** «Іншая краіна». «Паўднёвая Карэя: шлях тыгра».
**16.20** «Наша справа».
**16.50** «Па законе».
**18.30** «Вялікія тайны. Жыццё ў Сусвеце».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Гарады, якія спяваюць». Дзённік.
**20.30 Маст. фільм «Апошняе завяшчанне Нобеля».**
**23.00** «Ваенная тайна».
**0.45 «Адмірал». Серыял.**

### МІР

**5.00 Серыял «Пяць хвілін да метро».**
**6.35** М/ф.
**7.05** «Цік-так».
**7.20 Серыял «Заручальны пярсцёнак».**
**9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 21.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**9.10 Маст. фільм «Водпуск, які не адбыўся».**
**10.30, 0.35** «Свае людзі».
**10.55** «Разам».
**11.45** «Агульны рынак».
**12.20 Серыял «Клон».**
**14.10** Дак. фільм «У свеце цудаў».
**15.20, 22.05** Ток-шоу «Слова за слова».
**17.20 Серыял «Бумеранг з мінулага».**
**18.25** «Беларусь сёння».
**19.00 Серыял «Канвой PQ-17».**
**21.25** «Акцэнты».
**21.40** Дак. фільм «Рэальны свет».
**23.00 Серыял «Тайная варта».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Карціна свету».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Ранішняя@пошта».
**12.00** «Прамы эфір».
**13.00** «Маланка-забойца».
**13.50, 16.50, 19.50, 22.30** Навіны — Беларусь.
**14.30** «1000 дробязяў». Ток-шоу.
**15.10** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.55** «Асаблівы выпадак».
**17.10** «Шукальнікі».
**18.05 Серыял «Ефрасіння. Таежнае каханне».**
**18.55 Серыял «Тайны інстытута высакародных дзяўчат».**
**20.40 Серыял «Пілот міжнародных авіяліній».**
**22.40 Серыял «Земскі доктар. Вяртанне».**
**0.30** «Шум зямлі».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.40, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.00** «Да суда».
**11.55** «Суд прысяжных».
**13.25** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.25** «Справа ўрачоў».
**15.15** «Справа густу».
**15.40, 18.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.35 Серыял «Шэф-2».**
**21.25 Серыял «Пятніцкі. Глава трэцяя».**
**23.10** Сёння. Вынікі.
**23.35 Серыял «Гульня».**

### 8 КАНАЛ

***7.00—16.00 Прафілактыка.***
**16.00** Мультпарад.
**16.25** «Мой любімы гадаванец».
**16.55 Серыял «Пякельныя коткі».**
**17.45 Серыял «Касл».**
**19.15, 21.05, 23.45** «Надвор'е».
**19.20 Серыял «Цяжкі панядзелак».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.10 Драма «Баявы конь».**

### ВТБ

**6.00, 1.00** «PLAY».
**8.00, 14.00, 18.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.30, 17.30** «С.У.П.».
**9.00** «Сняданкі свету».
**9.30** «Дом мары».
**10.00** «Шчасце без ахвяр».
**11.00, 22.20 Серыял «Маргоша».**
**12.00, 21.10 Серыял «Маладзёжка».**
**13.00, 16.30** Скетч-шоу «Анекдоты».
**13.30, 17.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**14.30, 23.30** «Улётнае відэа».
**15.00 Серыял «Крамлёўскія курсанты».**
**16.00, 18.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**19.00 Серыял «Васьмідзясятыя».**
**20.00 Серыял «Апошні з магікян».**
**0.00** «Дарожныя войны».
**0.30** «Ч.П?».

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Быў час». 2008 год.
**6.00** «50/50». Тэлешоу. 1991 год.
**7.15** «Вакол смеху». 1983 год.
**8.40** «Знак пытання. Шанц». 1994 год.
**9.00 «Дзень першы, дзень апошні». Маст. фільм.**
**10.15** «Таццяна Тарасава і яе зоркі». 1992 год.
**11.00** «Тэатр+TV» «Вяртанне Вольгі Якаўлевай». 1994 год.
**12.00, 3.00** «Колба часу».
**13.00** «Уся ўлада ЛЮБЭ!». Фільм-канцэрт. 1991 год.
**14.00** «Успаміны пра Арно Бабаджаняна». 1988 год. Памяці кампазітара.
**15.10** «Дзесьці ёсць горад. Клуб землякоў». 1994 год.
**16.30** «Запрашае Барыс Ноткін». Сустрэча з У. Лісіцьевым. 1994 год.
**17.00** «З самага ранку». «Рэйс 9.10. Якія заблудзіліся ў часе». 1990 год.
**18.00** «Сакрэт Віктара Санеева». Дак. фільм.
**18.30** «Глядзіце, хто прыйшоў!». Фільм-спектакль. 1987 год. 1-я частка.
**20.00, 2.00** «Час».
**21.00** «Народжаныя ў СССР».
**22.00** «Вясёлая моладзь» «Я і іншыя я». 1990 год.
**23.00** «Чорная скрыня. Тайны архіваў КДБ». 1992 год.
**23.50** «Ранішняя пошта». 1985 год.
**0.30 «Гэтыя непаслухмяныя сыны». Маст. фільм.**
**1.40** «Музычная мазаіка». 1994 год.
**4.00** «Кінапанарама». Фрагменты выпускаў 1983/85/86 гг.

### EUROSPORT

**10.30** Спартыўнае падарожжа.
**10.35** Матаспартыўны ўік-энд.
**10.50** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг.
**11.45, 21.30** Снукер. Еўрапейскі тур. Фінал.
**12.45, 16.45, 1.30** Горныя лыжы. Кубак свету.
**13.15, 15.00, 18.00, 19.45** Футбол. Кваліфікацыя на чэмпіянат свету 2014.
**15.45, 20.30, 0.30** Футбол. Агляд кваліфікацыйных матчаў да чэмпіянату свету 2014.
**22.45** Вось гэта дзіва!!!
**23.00** Пра рэслінг.
**2.30** Скачкі на лыжах. Летні Гран-пры.

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05** Скетчком «Паміж намі».
**5.15, 8.00, 2.20** Серыял «Камп'ютаршчыкі».
**6.15** Камедыя «Алмазны сабака».
**9.00** Камедыя «Няўдачнікі».
**11.15** Маст. фільм «Дзядзечка Бак».
**12.55, 16.00, 21.00** Серыял «Прападобны».
**13.55, 15.45, 20.45, 23.50, 3.10** «Камедыянты. Лепшае».
**14.10** Камедыя «Як выйсці замуж за мільянера».
**17.20** Камедыя «Арлет».
**19.20** Камедыя «Два ў адным».
**22.10** Камедыя «Гульня ў чатыры рукі».
**0.10** Меладрама «Я ненавіджу Дзень Святога Валянціна».
**1.35** Камедыя «Шукальнік прыгод».
**3.25** Камедыя «Гаварыць прасцей».

### ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

**2.00, 8.00, 14.00** Меладрама «Вершнік над горадам».
**3.10, 9.10, 15.10** М/с «Светлячок» № 1. Зборнік м/ф «Козлік і вослік». «Што да чаго падобна». «Раз гарох, два — гарох». «Песенька ў лесе».
**4.00, 10.00, 16.00** М/с «Сандакан. Два тыгры». 1-я серыя. Казкі замежных пісьменнікаў. «Халіф-бусел». М/ф «Хто атрымае ананас».
**5.00, 11.00, 17.00** Маст. фільм «Вогненны стралок». М/ф «Проста так».
**6.30, 12.30, 18.30** М/с «Пісьмы ад Фелікса».
**7.00, 13.00, 19.00** «Урокі цётачкі Савы». Зборнік м/ф «Жарты». «Казка пра чужыя фарбы». «Мячык і хлопчык».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.45, 18.30, 3.45** «Цудоўнае стагоддзе». Серыял.
**10.15** «Паненка і кухар».
**10.45, 17.00** «Паралельны свет». Дак. серыял.
**11.45, 16.00** «Варажбітка». Дак. серыял.
**12.45, 18.00** «Паляўнічыя на прывідаў». Дак. серыял.
**13.10** «Жонка. Гісторыя кахання» Алена Якаўлева.
**14.30** «Сто пытанняў даросламу». Валерыя Гай Германіка.
**15.15, 0.15, 5.15** «Менталіст». Серыял.
**20.30** «Зонэнтау». Серыял. Заключная серыя.
**21.30** «Апостал». Серыял.
**22.30** «Бугімен 3». Серыял.
**1.00** «Звышнатуральнае». Серыял.
**1.50** «Сапраўдная кроў». Серыял.
**2.50** «Часова даступны». Міхаіл Паліцэймака.

### ТБ1000

**5.00** Драма «Сур'ёзны чалавек».
**6.50** Фільм жахаў «Ключ ад усіх дзвярэй».
**8.40** Баявік «Чалавек-павук 2».
**10.55** Баявік «Чалавек-павук 3».
**13.20** Меладрама «Каханне па правілах і без».
**15.35** Фэнтэзі «Тайна Мунакра».
**17.25** Драма «Пасажыры».
**19.05** Фантастыка «Зыходны код».
**20.45** Драма «Рэй».
**23.20** Трылер «Паляўнічы на забойцаў».
**1.05** Драма «Апусцелы горад».
**3.15** Фільм жахаў «Я ведаю, што вы зрабілі мінулым летам».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.00** Драма «Арэлі».
**8.00** Камедыя «Ёлкі».
**9.40** Дэтэктыў «Двайная пастка».
**12.10** Фільм-казка «Чароўная лямпа Аладзіна».
**14.00** Драма «Мора».
**16.00** Камедыя «Дзед Мароз заўсёды звоніць... тройчы!».
**18.00** Драма «Спакуса».
**20.00** Драма «Духless».
**22.00** Камедыя «Самы лепшы фільм 3-ДЭ».
**0.00** Маст. фільм «Ліса Аліса».
**2.00** Камедыя «У Расію за каханнем!».
**4.00** Камедыя «Атамны Іван».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00** Ліхтугі за мяжой.
**6.00, 16.00** Сесар Мілан: Важак зграі.
**7.00** Кенгуровы хаос.
**8.00, 13.00** Экстрэмальнае падарожжа.
**9.00, 14.00** Злавіць сома.
**10.00** Картачны фокуснік.
**11.00, 23.00** Турэмныя цяжкасці.
**12.00** Золата горада-прывіда.
**15.00** Гіганцкая панда.
**17.00, 2.00** Выратавальны атрад.
**18.00** Шаша праз пекла.
**19.00** Мегазаводы.
**20.00, 0.00** Джон Кенэдзі: Дзень, які змяніў усё.
**22.00** Гульні розуму.
**3.00** Джон Кенэдзі: Сем дзён, якія вызначылі прэзідэнта.

### DISCOVERY

**7.00, 16.25** Залатая ліхаманка.
**7.50, 12.20, 3.05** Голыя і напалоханыя.
**8.40, 20.35** Як гэта ўстроена?
**9.10, 20.05, 4.45** Як гэта зроблена?
**9.35, 17.20** Адпетыя рыэлтары.
**10.30** Цуды Сусвету.
**11.25, 3.55** Разбуральнікі легенд.
**13.15, 5.10** Хуткія і гучныя.
**14.10, 6.05** Махінатары.
**15.30** Хлопцы з гарматамі.
**18.15** Не спрабуйце паўтарыць.
**19.10** Геній распрацовак.
**21.00** Выжыць разам.
**22.00** Беар Грылс: выбрацца жывым.
**23.00** Правілы пазадарожнага руху.
**0.00** Цуды Сонечнай сістэмы.
**0.55** Top Gear ЗША.
**1.50** Вулічныя гонкі.
**2.40** Маланкавыя катастрофы.

## АЎТОРАК, 19 ЛІСТАПАДА

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.30** Навіны.
**7.05, 8.05** Дзелавое жыццё.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.10** Зона Х.
**9.10, 17.35** Серыял «Сэрца Марыі».
**10.05, 19.55** Серыял «Такое звычайнае жыццё».
**11.00** «Будзь у тонусе».
**12.10** Дзень у вялікім горадзе.
**13.20, 22.00** Дэтэктыў «Шулер».
**14.25** Terra incognita. Беларусь невядомая.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25** Арэна.
**15.45, 0.20** Серыял «Джамайка».
**16.50** «Здароўе». Ток-шоу.
**19.20, 0.00** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**23.45** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 21.20** Тэлебарометр.
**9.05, 17.55** Серыял «Двое з куфэрка».
**10.15** Цела чалавека.
**10.55** Рэпарцёр «Беларускай часінкі».
**11.50** Серыял «Следства вядзе Да Вінчы».
**12.55** Вышэй чым дах.
**13.55, 21.30** Серыял «Інтэрны».
**15.30, 23.00** Серыял «Рэальныя хлопцы».
**16.40** Беларуская часінка.
**18.55** Хакей. КХЛ. «Салават Юлаеў» — «Дынама» (Мінск).
**21.25** КЕНО.
**23.55** Футбол. Адборачны матч (U-21). Беларусь — Арменія.

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.30** «Дабраранак».
**8.00, 12.00, 18.55, 0.25** «Калейдаскоп».
**8.05, 12.10, 0.30** «Год у гісторыі».
**8.20** «Свет прыроды». Заказнік «Казьяны».
**8.55** «Творцы». Скульптар Іван Міско.
**9.35, 22.40** «Раскол». Маст. фільм.
**10.25, 22.10** «Дыя@блог». «Пра літаратуру».
**10.55** «Падкідыш». Маст. фільм.
**12.25, 0.00** «Святло далёкай зоркі».
**12.50, 23.30** «Аўтограф».
**13.25** «Скарбніца Міншчыны». Касцёл у Будславе.
**13.50** «І смех, і бяда». Кароткаметражны фільм.
**14.30** «Невядомы Напалеон». Прыступкі да трона.
**15.00** «Найменні і вобразы». Разьбярства.
**15.15** «Магіла льва». Маст. фільм.
**16.35** «У рэху імені твайго...». Бона Сфорца.
**16.50** «Цуды прыроды». Коста-Рыка. Кенія.
**17.15** «Я кахаю цябе...». Вершы Н. Мацяш.
**17.35** «Камертон». Любоў Казарноўская.
**18.00** «Карані».
**18.35** «Імгненні музейнай цішыні». Дак. фільм.
**19.05** «Сэрцы чатырох». Маст. фільм.
**20.30** Калыханка.
**20.50** «Вянок санетаў». Маст. фільм.

### БЕЛАРУСЬ 5

**8.05, 12.10** Футбол. Чэмпіянат свету. (U-20). 1/4 фіналу.
**9.50, 18.15** Авертайм.
**10.15** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Нёман» (Гродна) — ХК Віцебск.
**14.00** Валейбол. Еўраліга. Беларусь — Харватыя.
**15.50** Хакей. КХЛ. «Салават Юлаеў» — «Дынама» (Мінск).
**18.50** Футбол. Адборачны матч (U-21). Беларусь — Арменія.
**20.55** Гандбол. SEHA-ліга. «Татран» (Славакія) — БГК імя Мяшкова.
**22.25** Баскетбол. Ліга ВТБ. «Цмокі-Мінск» — ЦСКА.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!».
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** Серыял «Закрытая школа».
**12.10** «Самы лепшы муж».
**13.10** «Добрага здароўейка!».
**13.55** «Модны прыгавор».
**15.00** «Сам-насам з усімі».
**16.15** «Зразумець. Дараваць».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.20** «Наша Белараша».
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05** Драма «Дзённік памяці».
**23.20** «У доме бацькі».
**0.55** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**9.00, 13.50, 20.15** «Гарады, якія спяваюць». Дзённік.
**9.15** «Вялікія тайны. Жыццё ў Сусвеце».
**10.15** «Глядзець усім!».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.35** «Слова жанчыне». Серыял.
**12.30** «Джэймі: у пошуках смаку».
**13.00** «Цэнтральны рэгіён».
**14.05** «Гарады, якія спяваюць». Паўфінал.
**16.05** «Далёкія сваякі».
**16.50** «Па законе».
**18.30** «Нам і не снілася»: «Прадаўцы паветра». 1-я частка.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Гарады, якія спяваюць». Дзённік.
**20.30** Камедыя «Фантоцы бярэ рэванш».
**23.00** «Жывая тэма».
**0.00** «Аўтапанарама».
**0.25** «Адмірал». Серыял.

### МІР

**9.10** Маст. фільм «Сорак першы».
**10.50** «Свае людзі».
**11.15** «Навіны Садружнасці (бягучы радок). Культура».
**12.00, 15.00, 18.00, 21.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**12.20, 2.30** Серыял «Клон».
**14.10** Дак. фільм «У свеце цудаў».
**15.20, 22.05** Ток-шоу «Слова за слова».
**16.20** Серыял «Танга з анёлам».
**18.25** «Саюзнікі».
**19.00** Серыял «Канвой PQ-17».
**21.25** «Акцэнты».
**21.40, 4.25** Дак. фільм «Рэальны свет».
**23.00** Серыял «Тайная варта».
**0.35** «Свае людзі».
**1.00** Маст. фільм «Водпуск, які не адбыўся».

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Прамы эфір».
**12.40** Серыял «Справа следчага Нікіціна».
**13.50, 16.50, 19.50, 22.30** Навіны — Беларусь.
**14.30** «1000 дробязяў». Ток-шоу.
**15.10** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.55** «Асаблівы выпадак».
**17.10** Серыял «Права на праўду».
**18.05** Серыял «Ефрасіння. Таежнае каханне».
**18.55** Серыял «Тайны інстытута высакародных дзяўчат».
**20.40** Серыял «Пілот міжнародных авіяліній».
**22.40** Серыял «Земскі доктар. Вяртанне».
**0.30** «Спецыяльны карэспандэнт».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.40, 10.20** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.00** «Да суда».
**11.55** «Суд прысяжных».
**13.25** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.25** «Справа ўрачоў».
**15.10** «Справа густу».
**15.40, 18.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.35** Серыял «Шэф-2».
**21.25** Серыял «Пятніцкі. Глава трэцяя».
**23.10** Сёння. Вынікі.
**23.35** Серыял «Гульня».

### 8 КАНАЛ

**7.00, 12.30, 19.15, 21.05, 23.50** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.20, 14.25** Серыял «Цудоўнае стагоддзе».
**9.00, 17.45** Серыял «Касл».
**10.30** «Кулінарныя парады».
**11.00, 19.20** Серыял «Цяжкі панядзелак».
**12.35** Трылер «Уварванне».
**16.25** «Золата маўчання».
**16.55** Серыял «Пякельныя коткі».
**20.50** «Вечарніца».
**21.10** Драма «У краі крыві і мёду».
**23.20** Ток-шоу «Бульбокс».

### ВТБ

**6.00, 1.00** «PLAY».
**8.00, 14.00, 18.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.30, 17.30** «С.У.П.».
**9.00, 20.00** Серыял «Апошні з магікян».
**10.00, 19.00** Серыял «Васьмідзясятыя».
**11.00, 22.20** Серыял «Маргоша».
**12.00, 21.10** Серыял «Маладзёжка».
**13.00, 16.30** Скетч-шоу «Анекдоты».
**13.30, 17.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**14.30, 23.30** «Улётнае відэа».
**15.00** Серыял «Крамлёўскія курсанты».
**16.00, 18.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**0.00** «Дарожныя войны».
**0.30** «Ч.П?».

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Тэатр+TV» «Вяртанне Вольгі Якаўлевай». 1994 год.
**6.00, 15.00, 21.00** «Народжаныя ў СССР».
**7.00** «Уся ўлада ЛЮБЭ!». Фільм-канцэрт. 1991 год.
**8.00** «Успаміны пра Арно Бабаджаняна». 1988 год. Памяці кампазітара.
**9.10** «Дзесьці ёсць горад. Клуб землякоў». 1994 год.
**10.30** «Запрашае Барыс Ноткін». Сустрэча з У. Лісцьевым. 1994 год.
**11.00** «З самага ранку». «Рэйс 9.10. Якія заблудзіліся ў часе». 1990 год.
**12.00** «Сакрэт Віктара Санеева». Дак. фільм.
**12.30, 18.30** «Глядзіце, хто прыйшоў!». Фільм-спектакль. 1987 год.
**14.00, 20.00** «Час».
**16.00** «Вясёлая моладзь» «Я і іншыя я». 1990 год.
**17.00** «Эліта краіны Саветаў». Сустрэча з Валянцінам Фаліным.
**18.00** «Гэта было, было...». Фільм-канцэрт з удзелам Георга Отса. 1990 год.
**22.00** «Аповед пра некалькі дзён». Гастролі Рыкарда Фолы ў Маскве. 1985 год.
**23.00** «Быў час». 2008 год.
**0.00** «50/50». Тэлешоу. 1991 год.
**1.15** «Вакол смеху». 1983 год.
**2.40** «Знак пытання. Шанц». 1994 год.
**3.00** «Дзень першы, дзень апошні». Маст. фільм.
**4.15** «Тацццяна Тарасава і яе зоркі». 1992 год.

### EUROSPORT

**10.00, 11.30, 15.15, 21.00, 1.55** Валейбол. Сусветны Кубак Чэмпіёнаў.
**16.45** Коннаспартыўны часопіс.
**17.00** Горныя лыжы. Кубак свету.
**17.30, 19.15** Футбол. Кваліфікацыя на чэмпіянат свету 2014.
**20.00, 1.00** Футбол. Агляд кваліфікацыйных матчаў да чэмпіянату свету 2014.
**22.00** Бокс.
**0.00** Спартыўнае падарожжа.
**0.05, 3.25** Вось гэта дзіва!!!
**0.45** GTA. Наступны ўзровень.

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05** Скетчком «Паміж намі».
**5.15, 2.20** Серыял «Камп'ютаршчыкі».
**6.15** Маст. фільм «Дзядзечка Бак».
**8.00, 12.55, 16.00, 21.00** Серыял «Прападобны».
**9.00** Камедыя «Як выйсці замуж за мільянера».
**10.40, 13.55, 15.45, 23.50, 1.50** «Камедыянты. Лепшае».
**11.15** Камедыя «Арлет».
**14.10** Камедыя «Гульня ў чатыры рукі».
**17.20** Камедыя «Два ў адным».
**19.20** Камедыя «Няўдачлівыя».
**22.10** Дэтэктыў «Блакітнавокі Мікі».
**0.10** Камедыя «Няўдачнікі».

*3.00—9.00 Прафілактыка.*

### ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

**2.00, 8.00, 14.00** Фільм-казка «Марыя, Мірабела ў Транзісторыі».
**3.10, 9.10, 15.10** М/с «Светлячок». Зборнік м/ф «Жыў у бабулі казёл». «Казка за казкай». «Вясёлая карусель» № 13».
**4.00, 10.00, 16.00** М/с «Сандакан. Два тыгры». Казкі замежных пісьменнікаў. «Кот у ботах». Рускія народныя казкі. «Ліса і заяц».
**5.00, 11.00, 17.00** Маст. фільм «Цімур і яго каманда». 1-я серыя. М/ф «Роўна ў 3:15».
**6.30, 12.30, 18.30** М/с «Воўк Альберта». 1—3 серыі.
**7.00, 13.00, 19.00** «Урокі цётачкі Савы». Зборнік м/ф «Пілюля». «Згубілася птушка ў небе». «Паляўнічы і яго сын».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.50, 18.30, 3.45** «Цудоўнае стагоддзе». Серыял.
**10.30, 17.00** «Паралельны свет». Дак. серыял.
**11.30, 16.00** «Варажбітка». Дак. серыял.
**12.30, 18.00** «Паляўнічыя на прывідаў». Дак. серыял.
**13.00** «Зонэнтау». Серыял. Заключная серыя.
**13.50, 2.50** «Дом дагары нагамі».
**14.45** «Доктар І.».
**15.15, 0.15, 5.15** «Менталіст». Серыял.
**20.30** «Непераможны». Серыял.
**21.30** «Апостал». Серыял.
**22.30** «Кава і цыгарэты». Маст. фільм.
**1.00** «Звышнатуральнае». Серыял.
**1.50** «Сапраўдная кроў». Серыял.

### ТБ1000

**5.00** Драма «Рэй».
**7.35** Драма «Пасажыры».
**9.15** Трылер «Ідэальны незнаёмец».
**11.10** Драма «На краі».
**13.00** Фэнтэзі «Тайна Мунакра».
**14.50** Драма «Апусцелы горад».
**17.00** Фантастыка «Зыходны код».
**19.00** Трылер «Паляўнічы на забойцаў».
**21.00** Фільм жахаў «Я ведаю, што вы зрабілі мінулым летам».
**23.00** Трылер «Прыстанак».
**1.00** Драма «Спячая прыгажуня».
**3.00** Фільм жахаў «Готыка».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.00** Драма «Мора».
**8.00** Камедыя «Дзед Мароз заўсёды звоніць... тройчы!».
**10.00** Камедыя «У Расію па каханне!».
**12.00** Драма «Якія сышлі з нябёсаў».
**14.00** Камедыя «Самы лепшы фільм 3-ДЭ».
**16.00** Камедыя «Канікулы строгага рэжыму».
**18.10** Меладрама «Прагулка».
**20.00** Драма «Легенда №17».
**22.30** Драма «Мінесота».
**0.15** Камедыя «Атамны Іван».
**2.00** Драма «Аўсянкі».
**3.30** Камедыя «Адам і ператварэнне Евы».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00** Гульня ў лікі.
**6.00** Каралі рыбалкі.
**7.00** Тайнае логава акул.
**8.00** Джон Кенэдзі: Дзень, які змяніў усё.
**10.00** Мегазаводы.
**11.00** Закінутая магіла Ірада.
**12.00, 18.00** Шаша праз пекла.
**13.00** Джон Кенэдзі: Сем дзён, якія вызначылі прэзідэнта.
**15.00** Драконы-забойцы.
**16.00** На кручку: лоўля монстраў.
**17.00, 2.00** Выратавальны атрад.
**19.00, 22.00** Гульні розуму.
**20.00, 0.00** Джон Ф. Кенэдзі: Зніклая куля.
**21.00, 1.00** Файлы сакрэтных службаў.
**23.00** Турэмныя цяжкасці.
**3.00** Забойства Кенэдзі.

### DISCOVERY

**7.00, 16.25** Залатая ліхаманка.
**7.50, 12.20, 3.05** Голыя і напалоханыя.
**8.40, 20.35** Як гэта ўстроена?
**9.10, 20.05, 4.45** Як гэта зроблена?
**9.35, 17.20** Адпетыя рыэлтары.
**10.30, 0.00** Цуды Сонечнай сістэмы.
**11.25, 3.55** Разбуральнікі легенд.
**13.15, 5.10** Хуткія і гучныя.
**14.10, 6.05** Махінатары.
**15.30** Зброя па-амерыканску.
**18.15** Беар Грылс: выбрацца жывым.
**19.10** Правілы пазадарожнага руху.
**21.00** Дылеры.
**22.00** Паляўнічыя на склады.
**23.00** Скарбашукальнікі Амерыкі.
**0.55** Top Gear ЗША.
**1.50** Вулічныя гонкі.
**2.40** Маланкавыя катастрофы.

## СЕРАДА, 20 ЛІСТАПАДА

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.30** Навіны.
**7.05, 8.05** Дзелавое жыццё.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.10** Зона Х.
**9.10, 17.35** Серыял «Сэрца Марыі».
**10.05, 19.55** Серыял «Такое звычайнае жыццё».
**11.00** «Будзь у тонусе».
**12.10** Дзень у вялікім горадзе.
**13.20, 22.00** Дэтэктыў «Шулер».
**14.30** Terra incognita. Беларусь невядомая.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 0.20** Серыял «Джамайка».
**16.35** Зямельнае пытанне.
**17.05** БеларусьLIFE.
**19.20, 0.00** Спецыяльны рэпартаж.
**21.00** Панарама.
**23.50** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 21.20** Тэлебарометр.
**9.05, 17.55** Серыял «Двое з куфэрка».
**10.15** Цудоўная сямёрка. Другі эпізод. Фігурнае катанне.
**10.50, 0.10** Серыял «Следства вядзе Да Вінчы».
**12.20** Драма «Я помню...».
**14.05, 21.35** Серыял «Інтэрны».
**15.35, 23.10** Серыял «Рэальныя хлопцы».
**16.40** Беларуская часінка.
**18.55** Баявік «Снайпер-2. Тунгус». 1-я і 2-я серыі.
**20.40** Імперыя песні. На біс.
**21.25** «Спортлато 5 з 36».
**21.30** КЕНО.

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.30** «Дабраранак».
**8.00, 12.20, 18.30, 0.20** «Калейдаскоп».
**8.05, 12.25, 18.35, 0.25** «Галасы з мінулага».
